Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдактары—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нампарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нампарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нампарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 233 (2421) Аўторак, 9-га кастрычніка 1928 г.

У Лодзі бастуе 100.000 тэкстыльшчыкаў.

ВАРШАВА, 6-Х. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Лодзі пашыраецца. **БАСТУЕ БЛІЗКА 100.000 ЧАЛАВЕК.** *У Лодзі бастуюць усе тэкстыльшчыкі бяз выключэньня; у акрузе забастоўка ахапляе блізка 80 проц. рабочых. У Згіржы здарылася стычка паміж паліцыяй і бастуючымі, якія спрабавалі зьняць штрэйкбрэхераў з працы.*

Газэта «АБЦ» б'е трывогу з прычыны актыўнага ўдзелу камуністаў у кіраваньні забастоўкаю і патрабуе неадкладна прыштаваць усіх лодзінскіх камуністаў.

Адначасна газэта паведамляе, нібыта на савецка-польскай мяжы арыштаваны «два шпіёны, якія прыехалі з СССР». У арыштаваных «знойдзена дыслёкацыя прыгранічнага польскага войска і адрасаваная польскім камуністам інструкцыя з Масквы, як правадзіць забастоўку ў Лёдзі». Грубасьць і знарочнасьць гэтае выдумкі кідацца ў вочы. Гэтае насьпех згатаванае «паведамленьне» павінна, як думае яго аўтар, паслужыць «довадам», што забастоўка ў Лодзі —«справа рук Масквы».

Урачыстае спатканьне каманды „Красіна" ў Маскве.

МАСКВА, 7-Х. У нядзелю ў Маскву з Ленінграду прыехалі красінцы. Ужо загадзя а прыходу поезда на вялізным Каланчоўскім пляцу пануе нязвычайнае ажыўленьне: з усіх бакоў падыходзяць калёны дэгацый ад маскоўскіх фабрык і заводаў, стройнымі шэрагамі ідуць ячэйкі ТДА-Авіяхіму, дэлегацыі ад вайсковых часьцей маскоўскага гарнізону, нарэшце, тысячы рамадзян. На пероне стаіць шпалерамі ганаровая варта ТДА-Авіяхіму. Шмат сустракаючых, сярод якіх—італьянскі паведамы ў справах Квароні, прадстаўнікі нарвэскае дыпляматычнае місіі і дарадчык эха-славацкага паўнамоцнага прадстаўніцтва, члены прэзыдыуму ТДА-Авіяхіму, прадстаўнікі вайсковых і партыйных, прафэсыянальных грамадзкіх арганізацый, супрацоўнікі авецкага і замежнага друку.

Намесьнік наркому па вайсковых і марскіх справах і старшыня камітэту дапамогі дырыжаблю «Італія» т. Уншліхт прыняе рапарт ад камандзіра ганаровае варты.

Пад гукі «Інтэрнацыяналу», гром воплескаў і выгукі «ура» падышоў поезд з красінцамі. Тав. Уншліхт горача вітаецца з рафэсарам Самайловічам, Б. Г. Чухноўкім, капітанам Эгге, т. Орасам і шматлікімі. Прывітаньні Самайловічу, Чухноўкаму і іншым красінцам наступа з усіх бакоў. Галасы перакрываюць духавы аркестр. Пад націскам натоўпу, красінцы нарэшце пасоўваюцца да выхаду на двор вакзалу. Каля ўваходу красінцаў сустрэла пяцітысячная галоўная калёна делегацый, яная запоўніла ўвесь двор, з магутнымі выгукамі «ура» і прывітаньнямі, ад якіх літаральна дрыжаць шыбы вакзальнага памяшканьня. На вялізарных чырвоных транспарантах надпісы: «Слава героям Арктыкі», «Нехай жывуць красінцы» і інш. Тут-жа на задпіраваным грузавым аўтамабілі наладжваецца трыбуна. У працягу ананьскіх хвілін т. Уншліхту не ўдаецца дачыніць мітынгу з-за буры прывітаньняў, якія наступа адусюль.

Пралетарская Масква і ўся савецкая грамадзкасьць—гаворыць т. Уншліхт,—з адасьцю сустракаюць сваіх пасланцоў, якія дасканала выканалі ўскладзеную на іх важную задачу. Тольні таму, што нашая эксэдыцыя на поўночнае канцавосьсе была адзіная і моцна загартаваная, толькі таму, што ў ёй бралі ўдзел шматлікіяныя працоўныя масы Савецкага Саюзу, толькі таму, што яна ўяўляла сабою злучэньне працы і навукі—гэтая экспэдыцыя мела посьпех, выклікаўшы захапленьне ўсяго сьвету. Толькі тыя, якія выхаваліся ў цяжкай барацьбе за існаваньне савецкае дзяржавы на фронтах грамадзянскае вайны, здолелі перамагчы і суровыя ўмовы Арктыкі. Нехай жыве адзінства ў нашых шорагах, нехай жыве дыктатура пралетарыяту—гаворыць у канцы т. Уншліхт.

Тав. Алкеніс вітае ад імя чырвонага паветранага флёту, у асяродку якога выхаваўся Чухноўскі, Бабушкін і ўвесь лётны склад абедзьвюх экспэдыцый на «Красіне» і «Малыгіне».

Ад імя 1.400 тысяч маскоўскіх пралетарыяў, аб'яднаных МГСПС, выступіў т. Рокаж. Потым красінцаў віталі: ад міжнароднага таварыства Арктыкі інжынэр Вераб'ёў, ад рабочых Пуцілаўскага заводу—т. Петры, ад маскоўскіх рабочых—членаў ТДА-Авіяхіму т. Ціхаміраў і начальнік ленінградзкага порту т. Тымме.

Нарэшце выступіў сустрэчаны гучнымі воплескамі праф. Самайловіч, які выказаў ад імя экспэдыцыі «Красіна» шчырую падзяку працоўным Масквы за гарачае спатканьне і сымпатыі, якія красінцы знайшлі ў Маскве. З адказнымі прамовамі выступалі таксама Чухноўскі, камандзір «Красіна» Эгге, памоцнік кіраўніка экспэдыцыі т. Орас, памоцнік кіраўніка экспэдыцыі «Малыгіна» т. Лаўроў, старшыня камітэту каманды «Красіна» т. Філіпаў.

Пасьля мітынгу красінцы сядзяцца ў аўтамабілі і пад гучныя воплескі і гукі «Інтэрнацыяналу» накіроўваюцца ў вызначанае ім памяшканьне ў гатэлі «Эўропа».

ПРЫЁМ У ІТАЛЬЯНСКІМ КОНСУЛЬСТВЕ Ў ЧЭСЬЦЬ КРАСІНЦАЎ.

ЛЕНІНГРАД, 6-Х. Сёньня ў італьянскім консульстве адбыўся прыём і сьнеданьне ў гонар удзельнікаў экспэдыцыі на «Краціне». На прыёме прысутнічалі: італьянскі консул пан Бэры, т. т. Самайловіч, Чухноўскі, Орас, Эгге, прадстаўнікі каманды лёданолу, акадэмік Карпінскі і інш.

Парыскі „ліст Зіноўева".

Фальшыўкі, разрахаваныя на бульварную сэнсацыю.

ПАРЫЖ, 6-Х. Некалькі газэт перарукоўваюць з газэт «Газэтт-дэ-Франс» «Нансьён» агалошаныя імі два сакрэтныя дакументы французскае камуністычнае партыі», якія нібы «устаўляюць «абавязкі партыйных і раённых арганізацый» у момант рэвалюцыі. Водгук вымешчанага ў «дакументах» пляну, у патрэбны момант амуністычная ячэйка працаўнікоў пошты і тэлеграфу захопіць пошту, элеграф і радыё. Далей прадугледжаецца захап чыгунак, друкарняў, апарату агэнцтва Гавас, аэрадром, электрастанцыі, банкаў і інш. Старшынёю «французскага СНК» у дакуменцеазываецца Кашэн. Вайсковым і маркім міністрамі „будуць назначаны два асобы, прысланыя з Масквы».

Адзін з гэтых рассылцаў ужо нібы ў Парыжы. На чале «французскага НК» ангдлю» будзе пастаўлен «чыноўнік савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва».

«Юманітэ» наконт гэтага піша: „Ніколі яшчэ аб нас ня пісалі больш груба недарэчнага". Водгук слоў газэты «фальшыўкі разрахаваны на падрыхтоўку новага ўціску камуністаў аж да абвяшчэньня кампартыі нелегальнаю».

Газэта Мільлерана «Авэнір» лічыць дакументы «бязумоўна праўдзівымі». Падкрэсьліваючы, што на пасаду французскага «наркома гандлю» прызначаецца «чыноўнік з паўнамоцнага прадстаўніцтва", газэта пытае, ці брала ўдзел паўнамоцнае прадстаўніцтва ў распрацоўцы гэтага пляну. „Мы маем справу,—піша газэта,—з выкрываньнямі куды больш сур'ёзнымі, чымся інцыдэнт, які прымусіў нас вымагаць адкліку Ракоўскага».

«Эр Нувэль» агалашае фальшыўкі «ў якасьці кур'ёзу, да якога трэба адносіцца з асьцярогаю".

СЬВЕЖЫЯ РЭЗЭРВЫ УЦЯГВАЮЦЦА У ФРАНЦУСКУЮ СТАЧКУ.

ІА ПОЎНАЧЫ СТАЛІ 33 ТЭКСТЫЛЬНЫЯ ФАБРЫКІ. — ЗМАГАНЬНЕ КАМПАРТЫІ ЗА ПЕРАМОГУ БАСТУЮЧЫХ.

ПАРЫЖ, 6-Х. „Юманітэ" паведамляе, што ў Туркуэне да бастуючых учора далучылася яшчэ 10 тысяч рабочых. Забастоўка ахапіла 33 фабрыкі. Бастуючыя рабочыя ў Туркуэне заявілі на 4 масавых мітынгах, што будуць змагацца да перамогі.

Камуністычныя дэпутаты Пікемаль і Дэзаблен падалі ў палату запытаньне наконт забастовачнага руху тэкстыльных рабочых на поўначы Францыі і наконт пасылкі вайсковае сілы ў році бастуючых. У фінансавай камісіі палаты Пікемаль патрабуе даць крэдыт у разьмеры 1 міліёну франкаў на дапамогу бастуючым. Камуністычныя дэпутаты падтрымалі патрабаваньне аб крэдыце на дапамогу бастуючым «у тых выпадках, калі прадпрыёмцы ўпарта адмаўляюцца пачынаць перамовы з рабочымі». Большасьцю ўхвалена прапанова радыкалаў заслухаць у пачатку паведамленьне ўраду наконт характару і прычын забастоўкі і адмовіць у крэдытах, калі выявіцца, што забастоўка мае палітычныя мэты.

Дырыжэры антысавецкага аркестру.

ПАРЫЖ, 6-Х. „Юманітэ" піша: «Імпэрыялізм Францыі і Англіі выразна стаіць за плячыма генеральшчыны і дыпляматаў Польшчы і Румыніі і падбухторвае іх да выступленьня. Варожыя выпады французскага імпэрыялізму проці СССР за апошнія гады сталі больш частымі. Польшча, Румынія і Чэхаславакія, якія даўно мараць пра падзел СССР і пра захоп Украіны, падтрымліваюцца Францыяй. Ідучы на авантуры, Пілсудзкі выконвае даручэньні капіталістычных дзяржаў, у тым ліку Францыі. Пастаўка зброі і вайсковых прыладаў у Польшчу ня спынялася з 1919 году. У Румынію вайсковыя прылады рэгулярна накіроўваюцца праз французкія міжземнаморскія «партыі».

ТАЕМНАЕ СТАЛА ВЯДОМЫМ.

„ЭКО-ДЭ-ПАРЫ" ВЫКРЫЛА ШЫРОКА ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ ХАРАКТАР АНГЛА-ФРАНЦУСКАЕ ЗГОДЫ.

Абурэньне ангельскае грамадзкасьці проці ўраду.

ЛЁНДАН, 6-Х. «Эко-дэ-Пары» агалосіла англа-французкую дыпляматычную перапіску аб г. зв. марской згодзе. З перапіскі відаць, што згода датычыць ваенных мер ня толькі на моры, але і на сухавем'і.

«Дэйлі Тэлеграф» наконт гэтага піша: „Афіцыйныя колы ня могуць утаіць незадаволеньня парыскімі выкрываньнямі. Гэтае прывурочанае да непажаданага ім моманту агалашэньне вестак у друку з абурэньнем спаткана ў лёданскіх колах, як нівская спроба зьвязаць рукі ангельскаму ўраду ў пытаньні аб неабходнасьці агаласіць матар'ялы наконт англа-французкае згоды". Газэта ўспамінае, як два разы ў пачатку жніўня яна будучы абманута лёданскімі афіцыйнымі колами, няправільна паведаміла, што англа-французкая згода датычыць выключна абмежаваньня марскіх узбраеньняў.

Лібэральная «Дэйлі Ньюс» у вострым тоне піша: «Парыскія выкрываньні пацьвярджаюць найгоршую апаску. Папершае, яны абяртаюць у фарс усякую далейшую дыскусію аб скарачэньні сухаземных узброеньняў; падругое, пазіцыя ангельскага ўраду ў пытаньні аб разброеньні безнадзейна вызначана наперад. З якім тварам цяперашні ангельскі ўрад можа ізноў выступіць перад сьветам у якасьці барацьбіта за разброеньне? Газэта востра нападае на міністэрства замежных спраў за ўтойваньне праўды аб англа-французкай згодзе і за няверныя паведамленьні. Газэта падкрэсьлівае, што Чэмбэрлен і Кешэндэн публічна заявілі, што кампраміс мае толькі марскі характар, і патрабуе, каб Бальдвін выступіў з неадкладнымі растлумачэньнямі.

«Дэйлі Геральд» падкрэсьлівае, што міністр замежных спраў і члены габінэту сьвядома спрабавалі ашукаць парлямант і край, заяўляючы, што англа-французкая згода мае чыста марскі характар. Газэта дадае: «Мы ізноў перажываем найгоршыя дні таемнае дыпляматы найгоршае ўласьцівасьці—дні тайных згодаў і нясумленных, неганаровых адхіленьняў".

Водгукі ў Італіі.

РЫМ. 6.Х. Італьянскі друк жвава абмяркоўвае выкрыцьці „Эко-дэ-Пары». Увесь друк зазначае, што меркаваньні наконт наліччя шырокае англа-французкае згоды пацьверджаюцца з усіх бакоў.

«Трыбуна» кажа, што ўсе выкрыцьці аб англа-французкай згодзе па дзіўнай выпадковасьці паходзяць з французкіх крыніц. Газэта бачыць у гэтым намер Францыі адцяць Англіі шлях да адступленьня. Магчымыя заверэньні Парыжу і Лёндану, што між імі ня існуе ўгавору, газэта адхіляе заўвагаю, што даваенная Антанта таксама грунтавалася больш на вусных змовах між генэральнымі штабамі, чым ся на нармальных угаворах. Нарэшце газэта піша: «За плячыма Лігі Нацый пад прыкрыцьцём дапамогі канфэрэнцыі аб разброеньні Лёндан і Парыж, шляхам сэкретных перамоў, выпрацавалі згоду 2-х дзяржаў, якая гарантуе ім пануючае становішча на сухазем'і і на моры. Усё іншае — нікчэмная балбатня".

«Лявоpо д' Італія» асабліва падкрэсьлівае той факт, што Англія і Францыя ўмовіліся лічыць згоду правамоцнаю нават у выпадку адхіленьня яе прынцыпаў іншымі дзяржавамі.

ПРЫГОЖАЯ ПОЗА ПРЫ НЯПРЫГОЖАЙ ГУЛЬНІ.

ЛЁНДАН, 6-Х. Міністэрства замежных спраў заяўляе, што агалашэньне парыскаю газэтаю «Эко-дэ-Пары» англа-французкае перапіскі «ня зьменіць погляду ангельскага ўраду на час і спосаб афіцыйных растлумачэньняў.»

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Сялянскі бунт у Ашмяншчыне.

„Слово" (№ 229) паведамляе, што на абшары маёнтку Даўляны, уласнасьці маркграфіні Умястоўскай, знаходзіцца лес пад назвай «Новая Пушча». Да гэтага лесу, ці нават толькі да часткі яго мелі пратэнзію сяляне. З мэтаю высьвятліць справу на месца прыбылі землямеры і пачалі мераць і ставіць слупы. Тады сяляне, узброеныя сякерамі і кіямі, прышлі вялікім натоўпам і, прагнаўшы землямераў, зьнішчылі слупы і працерабілі зарасьлі. Сітуацыя стала пагражаючай. Умяшаньне ў справу старасты не дало пажаданых вынікаў, ён прыслаў тады ў загрожаную мясцовасьць шмат паліцыі, якая арыштавала трох сялян. Аднак, і гэта не памагло. Сяляне суседняй вёскі далучыліся да ўзбунтаваных сялян. в. Дасілы. Віленскі ваявода выслаў на месца бунту свайго дэлегата п. Канклку, якому даручыў разабрацца ў справе.

Звальненьне з астрогу б. сэкратара „Грамады".

Гэтымі днямі звольнены з астрогу ў Відьні б. сэкратар «Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады» і кандыдат у паслы сойму ад Сьвенцяншчыны С. Астапчык. Астапчык быў пасаджаны ў астрог сем месяцаў таму назад па абвінавачаньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Канфіскацыя „Слова Працы".

5 кастрычніка г. г. віленскі гарадзкі стараста канфіскаваў наклад беларускай газэты „Слова Працы" № 1, якая пачала відаць выходзіць замест «Рэха Працы», дабітай канчаткова нясупынымі канфіскацыямі.

Канфіскавана „Слова Працы" за „шораг тэндэнцыйных і антыдзяржаўных артыкулаў", у якіх угледжаны праступленьні проці 129 арт. К. К. і п. 1 распараджэньня прэзыдэнта.

НАСТУП ПІЛСУДЧЫКАЎ НА КАНСТЫТУЦЫЮ.

ВАРШАВА, 6-Х. Увесь друк пілсудчыкаў салідарызуецца з інтэрв'ю прэм'ера Бартэля, у якім ён выказаўся за перагляд канстытуцыі польскае дзяржары.

Прысуд над Дробнэрам.

Акруговы суд у Быдгошчы прыгаварыў правадыра польскай партыі незалежных сацыялістаў Б. Дробнэра на два гады астрогу за выступленьні ў часе выбараў у сойм, залічыўшы папярэднюю адсідку.

Арышт ковенскіх шпіёнаў.

Некалькі дзён таму назад польская паліцыя арыштавала на польска-літоўскім пагранічны пяць літоўскіх грамадзян, западозраных у шпіянажы. «Слова» (№ 230), якое паведамляе аб гэтым, прыпушчае, што арыштаваныя належаць да вялікай шпіёнскай арганізацыі.

Канфіскацыя лятучак ППС—лявіцы.

Гэтымі днямі віленскі гарадзкі стараста канфіскаваў наклад лятучак ППС—лявіцы, выданых пад назвай: „Таварышы і Таварышкі! - Да агулу Работніцка-Сялянскай Моладзі. Прэч з вайной проці СССР!"

Канфіскацыя „Маланкі".

Віленскі гарадзкі стараста канфіскаваў гэтымі днямі чарговы нумар „Маланкі", гумарыстычнай беларускай часопісі.

Гандаль Польшчы з СССР.

Паводле статыстычных даных, у мінулым месяцы праз пагранічныя станцыі Загацьце і Стоўпцы прывезена в Польшчы ў СССР 28 вагонаў жалеза, 25 вагонаў вугалю, 7 вагонаў дроту і 6 вагонаў цэглы. З СССР у той самы час прывезена ў Польшчу 18 вагонаў калёш, вагон нітак і вагон лялек.

Пажары ў Люблінскім ваяводзтве.

«Глос Правды» (№ 277) піша, што кожны год у Люблінскім ваяводзтве хваля пажараў разрастаецца ўсё больш. У працягу 9 месяцаў, ад 1 студзеня да 1 кастрычніка г. г. згарэла каля 5000 будынкаў, а страты раўняюцца 2174249 злотых.

Выбух у адлеўні.

У варшаўскай адлеўні пад фірмай «Фінк і Вінэле» 5 кастрычніка г. г. з невядомай прычыны здарыўся выбух у печы. Адломак жалеза ўгадзіў работніка Т. Жэзніцкага ў правае плячо і твар.

Страшная бура ў Лідзкім павеце.

Над Ганчарскай, Беліцкай і Дакудаўскай валасьцямі праneслася гэтымі днямі страшная бура, прычыняючы вялікія шкоды. Ад пяруна згарэла шмат будынкаў і забіта два чалавекі.

БЫЦЬ НА ВАРЦЕ!

Выступленьні польскага міністра замежных спраў Залескага як у друку, так і ў шэрагу эўрапейскіх сталіц з вострымі выпадамі супроць СССР, «спацыраваньне» розных ангельскіх і французкіх генэралаў па сумежных з намі лімітрофных дзяржавах, надаўнае правакацыйнае выступленьне валынскага ваяводы Юзэфскага з плянамі «вялікай Украіны», наведаньне румынскай вайсковай місіяй Варшавы, і нядаўні візыт польскага дыктатара Пілсудзкага ў Бухарэст,—усё гэта ясна падкрэсьлівае тое, што за кулісамі эўрапейскай палітыкі імпэрыялісты дзейна рыхтуюцца да вайны з намі, што пытаньне аб зьнішчэньні або па меншай меры аб аслабленьні першай у сьвеце рэспублікі працоўных вельмі іх цікавіць.

Хвалі эканамічных забастовак, якія маюць адначасна яскравы палітычны характар, цяжкасьці капіталістаў у пытаньні збыту прадукцыі іх фабрык і заводаў і наша ўзрастаючая эканамічная магутнасьць вельмі непакоіць капіталістаў і змушаюць іх з яшчэ большай энэргіяй інтрыгаваць супроць нас.

У гэтым сэнсе вельмі цікавым зьяўляецца выкрыцьцё бухарэсцкім карэспандэнтам нямецкай газэты «Бэрлінэр Тагеблят» навейшага пляну імпэрыялістаў аб ваенным паходзе на СССР, пляну, у якім першую скрыпку грае капіталістычная Францыя. Плян задуман вельмі шырокі. Мараць ня больш і ня менш, як аб аддзяленьні ад Савецкага Саюзу земляў, што ляжаць паміж Днястром і Дняпром—з Менскам, Кіевам і Адэсай. Асе гэтыя землі Францыя хоча далучыць да Польшчы, каб такім чынам, арганізаваўшы моцную польскую дзяржаву, аддзяліць канчаткова Савецкі Саюз ад Нямеччыны.

Ажыцьцёвіць гэты свой шырокі плян наскоку на Савецкі Саюз Францыя мяркуе пры дапамозе Польшчы і Румыніі. Польшча зацікаўлена ў гэтай ваеннай авантуры тым, што ў выпадку адыходу земляў між Днястром і Дняпром да Польшчы, наміж ёю і Савецкім Саюзам створыцца карыдор, які забясьпечыць ёй уладаньне Бэсарабіяй.

У гэтым мяркуемым наскоку на Савецкі Саюз Францыя, апроч дапамогі грашыма, ваеннымі парадамі і амуніцыяй, хоча прыняць удзел і ў ваенных эпэрацыях пасылкаю праз Нямеччыну невялікіх вайсковых кантынгентаў на будучы тэатр ваенных дзеяньняў. Нямеччыне-ж за пропуск французкага войска праз яе тэрыторыю мяркуецца аддаць данцыгскі калідор, тым больш, што Польшча магла-б здаволіцца портам Адэсы ці атрымаць выхад у мора шляхам акупацыі Літвы або якой-небудзь іншай акраінай дзяржавы.

Адносна гэтага і радзіўся в прадстаўнікамі шэрагу капіталістычных дзяржаў французкі генэрал Леронд у часе свайго апошняга падарожжа па Польшчы, Чэха-Славакіі, Румыніі, Юга-Славіі і Баўгарыі.

Як паведамляе далей карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблят», Англія ўжо дала сваю згоду на гэты плян, хоць непасрэднага ўдзелу ў гэтай чарговай авантуры пакуль што прымаць ня зьбіраецца.

Але, ведаючы добра яе адносіны да Савецкага Саюзу, мы можам ужо зараз з упэўненасьцю сказаць, што тое ці іншае садзейнічаньне гэтаму пляну ў поўнай меры забясьпечана.

Што датычыцца рэшты капіталістычных дзяржаў Заходняй Эўропы, дык міністр замежных спраў Юга-Славіі і вайсковыя колы гэтай краіны адносяцца спачуваюча да гэтых плянаў, хоць грамадзкая думка пакуль што супроць іх. Чэха Славакія ў асобе міністра замежных спраў Бэнеша і прэзыдэнта рэспублікі Масарыка таксама адабраюць гэты плян, бо пры яго дапамозе спадзяюцца стварыць вялікі ўсходні блёк з Польшчы, Украіны, Чэха-Славакіі, Аўстрыі, Юга-Славіі і Румыніі, які меў-бы арыентацыю на Францыю і быў-бы накіроўваны супроць СССР.

Апроч таго, спадзяюцца, што гэты ўсходні блёк перашкодзіць збліжэньню Савецкага Саюзу з Нямеччынай, якога так баяцца ўсе прадстаўнікі як вялікай, так і малой Антанты.

Невядома яшчэ толькі пазіцыя Італіі і Баўгарыі. Асабліва апошняя непакоіць імпэрыялістаў Францыі, бо ўгаворы французкага генэрала Леронда ўвайсьці ў арбіту французкай палітыкі да гэтага часу нібыта ў Сафіі асабліваго посьпеху ня мелі.

Словам, падрыхтоўка да вайны з намі ідзе поўным ходам і «міратворчы дух» пакту Келёга дае ўжо зараз свае лёгічныя вынікі.

Ці варта гаварыць, што ўся польская шавіністычная прэса, як «Глос Правды», «Кур'ер Польскі», краканўскі «Кур'ер Ілюстраваны» і «Слова Польске» ў адзін голас і ўсімі спосабамі адмаўляюць існаваньне агрэсыўнага супроць СССР пляну, пра які піша бухарэсцкі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблят», але мы дасканала ведаем цану падобных «абвяржэньняў».

Мы ня ведам, наколькі правільны ў сваіх падрабязнасьцях весткі карэспандэнта „Бэрлінэр Тагеблят", але палітыка апошніх год нашых ворагаў выразна накіравана на падрыхтоўку вайны з намі.

ПАМЁР тав. Скварцоў-Сьцяпанаў

МАСКВА, 8-Х. Па вестках, атрыманых НК Аховы Здароўя, тав. Скварцоў-Сьцяпанаў памёр у Сочы (Чорнаморскае ўзьбярэжжа) 8 кастрычніка а 4 гадз. 30 хвілін ад цяжкай формы брушнога тыфусу.

МАСКВА. У СОЧЫ ПАМЁР РЭДАКТАР „ИЗВЕСТИЙ ЦИК СССР„ ТАВ. СЬЦЯПАНАЎ-СКВАРЦОЎ. ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАХАВАНЬНЯ ТАВ. СЬЦЯПАНАВА-СКВАРЦОВА ЎТВОРАНА КАМІСІЯ ПАД СТАРШЫНСТВАМ ТАВ. БУБНОВА. У КРЭМЛІ АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ГЭТАЙ КАМІСІІ, ДЗЕ АБГАВОРАН І НАМЕЧАН ПАРАДАК ПАХАВАНЬНЯ. ЦЕЛА ПАМЁРШАГА ПЕРАВОЗІЦЦА З СОЧЫ Ў МАСКВУ.

КАМІСІЯ ВЫНЕСЛА ПАЖАДАНЬНЕ, КАБ ЗАМЕСТ ВЯНКОЎ УНОСІЛІСЯ РОЗНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ГРАШОВЫЯ СУМЫ Ў СПЭЦЫЯЛЬНЫ ФОНД ІМЯ СКВАРЦОВА-СЬЦЯПАНАВА, ПРЫЗНАЧЭНЬНЕ ЯКОГА БУДЗЕ ЎСТАНОЎЛЕНА Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС.

ТЭЛЕГРАМА ЦК УсеКП(б) АД ЦК КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б разам з усёй УсеКП(б) сумуе аб утраце аднаго з заснавацеляў нашай партыі, аднаго з лепшых марксыстых і тэарэтыкаў партыі, выхавацеля яе шэрагаў І. І. Скварцова-Сьцяпанава.

ЦК КП(б)Б.

ТЭЛЕГРАМА ЦВК СССР АД ЦВК БССР.

Неспадзяваная сьмерць тав. І. І. Скварцова-Сьцяпанава вырвала з шэрагаў кампартыі, з шэрагаў ураду СССР аднаго з найстарэйшых членаў партыі, выдатнага сілаю волі, багацьцем энэргіі, ведамі і адказнасьцю пры выкананьні абавязкаў. „Известия" згубілі ў асобе тав. Скварцова-Сьцяпанава выдатнага кіраўніка.

Прэзыдыум ЦВК БССР з вялікім жалем адзначае гэтую неспадзяваную страту і дзеліцца гэтым з урадам СССР, з калектывам супрацоўнікаў і з чытачамі „Известий ЦИК ССР".

ЦВК БССР.

Да ўсіх членаў КП(б)Б, да ўсіх рабочых.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі з глыбокім жалем паведамляе ўсіх членаў партыі аб сьмерці аднаго з вэтэранаў рэвалюцыйнага руху ў Расеі, члена ЦК ВКП(б), адказнага рэдактара „Известий ЦИК СССР» тав. Івана Іванавіча Скварцова-Сьцяпанава.

Тав. І. І. Скварцоў-Сьцяпанаў зьяўляецца адным з заснавацеляў бальшавіцкай партыі. Яшчэ ў пачатку 90-х гадоў ён удзельнічае ў першых марксысцкіх гурткох у Расеі і зьяўляецца адным з арганізатараў першага сац.-дэмакратычнага камітэту ў Маскве, а ў 1917 годзе адным з віднейшых арганізатараў люгаўскага і кастрычнікаўскага паўстаньня ў Маскве.

Тав. І. І. Скварцоў-Сьцяпанаў мае шматлікія літаратурныя працы па філёзофіі марксызму і палітычнай эканоміі.

Яго кніга аб электрыфікацыі Саюзу ў свой час была высока ацэнена т. Леніным. Па вучэбніку палітэканоміі, складзенаму І. І. Скварцовым-Сьцяпанавым, пачынаючы з 90-х гадоў, вучыліся пакаленьні — бальшавікоў.

Нябошчык таксама зьяўляўся адным з лепшых знаўцаў Леніна і ленінізма, займаў пост Дырэктара Інстытуту У. І. Леніна.

Цяжкая ўтрата панесена партыяй у асобе памёршага І. І. Скварцова-Сьцяпанава.

ЦК КП(б)Б разам з усёй УсеКП(б) і рабочай клясай сумуе аб гэтай утраце і прызывае ўсіх членаў партыі яшчэ мацней згуртаваць шэрагі бальшавікоў, яшчэ дружней работаць на ўсіх вучастках сацыялістычнага фронту, верным і стойкім салдатам якога заўсёды быў нябошчык І. І. Скварцоў-Сьцяпанаў, нязьменна вёўшы барацьбу да апошняга дня супроць усякіх ухілаў і скрыўленьняў ленінскай лініі.

ЦК КП(б)Б.
МЕНСКІ АКРУГКОМ КП(б)Б.

* * *

Скварцоў Іван Іванавіч (К. Сьцяпанаў)—сын канторскага работніка адной з фабрык Маскоўскага павету, нарадзіўся ў лютым 1870 г., скончыў гарадзкое вучылішча, пасьля—Маскоўскі вучыцельскі інстытут, быў настаўнікам у маскоўскай школе да 1890 г. У гэтым годзе ён быў арыштаваны і высланы з Масквы.

У 1901 г., пасьля каапітацыі яго ў маскоўскі камітэт РСДРП, быў зноў арыштаваны і высланы на 3 гады ў Сібір. Пасьля гэтага, тав. І. І. Скварцоў-Сьцяпанаў зноў займаецца лектарскай працай пры маскоўскім камітэце РСДРП.

Быў выдзелены кандыдатам ад бальшавікоў у 3-ю Дзяржаўную думу.

У 1911 г. быў высланы ў Архангельскую губэрню, пасьля прымаў удзел у розных бальшавіцкіх выданьнях.

Тав. І. І. Скварцоў-Сьцяпанаў быў гісторыкам-эканамістым, вядомым як перакладчык «Капітала» на расейскую мову.

Пасьля лютаўскай рэвалюцыі быў назначан рэдактарам „Известий Московского Совета", летам 1917 году—старшынёю бальшавіцкай фракцыі ў Маскоўскім гарсавеце. На XIУ партзьезьдзе абраны членам ЦК, быў на розных партработах. У 1920 годзе ўдзельнічаў у баях на заходнім фронце. У лістападзе 1925 году—рэдактарам «Известий ЦИК СССР». У часе ленінградзкай апазіцыі, калі адзінству партыі пагражала вялікая небясьпека, калі «Ленинградская Правда» была захоплена апазіцыянэрамі, т. Скварцоў-Сьцяпанаў быў назначан рэдактарам «Ленинградской Правды».

СОЧЫ, 8-Х. У полудзень адбыліся провады ў Маскву астанкаў тав. Скварцова-Сьцяпанава. Ад імя ўраду і партыі разьвітальную прамову сказаў тав. Сьмідовіч.

Фашысцкі гвалт над воляю аўстрыйскіх рабочых.

Кампартыя на паўлегальным становішчы.

ВЕНА, 6-Х. У ліку арыштаваных учора 9 сьпроў антыфашысцкага камітэту пралетарскае абароны знаходзіцца старшыня ЦК аўстрыйскае кампартыі Цыглер, 4 сацыял-дэмакраты, у тым ліку сябры дэлегацыі ў СССР Шітцаль і Лярэс.

Сёньня зноў канфіскован нумар «Ротэ Фанэ» (орган кампартыі). Агалошаная ў гэтым нумары адозва зазначае, што камуністычная партыя ўжо фактычна перайшла на паўлегальнае становішча; кожны дзень можа здарыцца так, што партыя прымушана будзе перайсьці на нелегальнае становішча. Адозва высоўвае такія лёзунгі: «Масавы ўдзел рабочых у дэманстрацыях у Вінэр-Нэйштадце, усе вуліцы, якія вядуць да дэманстрацыі фашыстаў, павінны быць заняты; ніякіх дэмаркацыйных ліній; забастоўка чыгуначнікаў; неадкладнае спыненьне працы ў прамысловых абласьцёх; акупацыя вакзалу; неабходна перашкодзіць параду фашыстаў на адпраўных пунктах».

Афіцыёз «Рэйхспост» паведамляе, што ў Вінэр-Нэйштадзе сёньня ўзмоцнены мерапрыёмствы па захове парадку. У цэнтр гораду можна трапіць толькі маючы спэцыяльныя пасьведчаньні. Жандармскія патрулі шукаюць у памяшканьнях прыежджых. У прамысловых раёнах Ніжняе Аўстрыі ад поўдня забаронен продаж гарэлачных напіткаў, зачыняюцца ўсе гандлёвыя прадпрыёмствы. Сацыял-дэмакратычны бургамістр у Вінэр-Нэйштадце загадаў расклеіць усходы плякаты з заснаваньнем жыхарства.

ЧЭХАСЛАВАЦКАЯ КАМПАРТЫЯ АЧУНЬВАЕ АД КРЫЗІСУ.

ПРАГА, 5-X. Агалошана справаздача і рэзалюцыя пленуму ЦК чэхаславацкае кампартыі, які пасядаў разам з дэлегацыяй партыі на VI кангрэсе Камінтэрну. Пленум далучаецца да ўсіх пастаноў кангрэсу і характарызуе сучасны момант, як пэрыяд абвастрэння клясавых супярэчнасьцяў і парастаньня васпнае небясьпекі. Далей рэзалюцыя адзначае посьпехі СССР, поўнасьцю адабрае палітыку УсеКП(б) і зварачвае ўвагу сяброў партыі на выключнае значэньне ўхваленае кангрэсам праграмы.

У частцы рэзалюцыі, прысьвечанай становішчу ўнутры партыі, пленум выказвае поўную згоду з адкрытым лістом выканкому Камінтэрну.

БЛІЗКІ ПАЧАТАК САВЕЦКА-ЭСТОНСКІХ ПЕРАМОЎ.

РЭВЕЛЬ, 5-X. Дэклярацыя старшыні ўраду (прэм'ера) Тэмнісона на адчыненьні эстонскага парляманту зьмянчала пералік законапраэктаў, якія ўрад няркуе падаць на абмеркаваньне парляманту. Між іншым, у дэклярацыі гаворыцца, што пачалася падрыхтоўчая праца да перамоў аб гандлёвым угаворы з СССР

Катаваньні ў латвійскіх астрогах.

РЫГА, 5-X. Арыштаваны нядаўна дзеяч левага крыла рабочага руху Штраўпман стаў у выніку катаваньняў калекаю. Штраўпмана носяць на насілках на допыты.

У ЛАТВІІ.

(Ад уласнага карэспандэнта).

РАЗГРОМ ПАРТЫІ НЕЗАЛЕЖНЫХ САЦЫЯЛІСТАЎ.

Латвійская буржуазная ўлада выкарыстала на ўсе 100 проц. першае рэвалюцыйнае выступленьне латыскіх рабочых 22 жніўня. Гэтае выступленьне, з недазволенымі ўрадам дэманстрацыямі, дала міністру ўнутраных спраў повад і нейкую «відзімасьць» права ня толькі ня спыняць распачатага ім паходу супроць працоўных, але яшчэ шырэй разьвярнуць гэты паход і надвесьці над яго «праўны» фундамант.

Сьледам за спыненьнем працы 19 прафэсыянальных арганізацый левых рабочых, супроць чаго і ўзьняліся пратэсты і дэманстрацыі 22 жніўня—цяперака „часова прыпынена" праца партыі незалежных сацыялістаў. Прыпыненьне працы партыі ў разгар перадвыбарчае барацьбы і ўсяго за два тыдні да самага галасаваньня—раўнажна поўнаму разгрому яе.

Сам міністар унутраных спраў, Лаймінш, не пажадаў узяць на сабе поўную адказнасьць за гэты разгром і схаваўся за плечы адміністрацыйнага аддзелу рыскага акруговага суду, які вынес гэтую пастанову.

Так званы «незалежны» суд Латвіі спынуў працу партыі незалежных сацыялістаў, а паліцыйскія ўлады ў дадатак да гэтага арыштавалі і тых апошніх з сяброў цэнтральнага камітэту гэтае партыі, якія яшчэ ўдзелі былі нейкім чудам ад агульных арыштаў 22, 23 і 24 жніўня.

Цяперака партыя ня толькі спынена, але арыштаваны і пасобныя найбольш энэргічныя сябры. Тыя сябры, што асталіся на волі, з правіленьняў розных аддзелаў партыі і дэпутат сойму фракцыі незалежных т. Яўдзем, каб закончыць апошнія два тыдні выбарчае барацьбы залажылі было выбарчае бюро свайго сьпіску, каб, працуючы ўжо не як партыя, а як грамадзяне, падаўшыя сьпісак № 19, зрабіць некалькі апошніх сходаў і выпусьціць належныя адозвы. Адзак, сходы сябрам гэтым склікаць не дазволена, выпушчаная імі літаратура зараз жа канфіскавана, а бюро зачынена—і распаліся новыя арышты.

ФАШЫСТЫ ШУКАЮЦЬ ХАЎРУСУ З БЭРМОНТАЎЦАМІ.

У запятай барацьбе з працоўнымі фашысты шукаюць хаўрусу з такімі нават групамі, якія воража ставяцца ня толькі да працоўных, але і да самае ідэі незалежнае Латвіі, як дзяржавы.

Найгоршым ворагам новапаўстаўшай Латвійскай рэспублікі былі і ёсьць нямецкія бароны, якія арганізавалі ў 1919 годзе залую армію фон-дэр-Гольца і Бэрмонта і павялі наступ на Рыгу, каб захапіць яе ў свае рукі і скасаваць зямельную рэформу і рэспубліку. Спроба гэтая не ўдалася. Нямецка-баронскае войска і расейскія чорнасоценцы былі разьбіты. Правадыры гэтае авантуры ўцякілі ў Бэрлін і былі абвешчаны па-за законам.

Дзесяць год аб іх на было ні слуху ні духу. Яны баяліся нос свой паказаць у Латвію, а калі сюды прыехаў стары латвійскі вядомы пісьменьнік Недра, што хаўрусаваў з нямецкімі баронамі і быў на іх баку, дык яго, ня гледзячы на ягоныя літаратурныя заслугі і старасьць, арыштавалі, судзілі і пасадзілі ў турму.

Цяперака, узростам рэакцыі ў Латвіі, латвійскія фашысты кідаюцца за ўсе бакі, каб навербаваць сабе прыхільнікаў і ў краі і па-за межамі. Таму Недру ўжо выпусьцілі з турмы і ён выехаў у Нямеччыну, а затое сюды ў Латвію адзін-за-адным прыяжджаюць былыя супрацоўнікі Недры, фондэр-Гольца і Бэрмонта, нават былыя міністры іх ураду, якія актыўна і аружна змагаліся з Латвійскай рэспублікай і яе ўрадам. Усім прыяжджаючым выдае візы латвійскае консульства ў Нямеччыне, а тут, у Рыве, ніхто гэтых бэрмонтаўцаў не чапае.

Зараз-жа пасьля разгрому прафэсыянальных арганізацый левых рабочых у жніўні месяцы атрымаў «амністыю» і высланы з Латвіі пры эс-дэкаўскім урадзе вядомы латвійскі фашыст Поне, які цяперака зноў аб'яжджае Латвію і аднаўляе свае арганізацыі „Латвійскага нацыянальнага клюбу" (арганізацыя па духу і па «мэтадах» працы паўожа да былога расейскага „союза русского народа").

МАНАРХІСТЫ АФІЦЫЙНА АРГАНІЗУЮЦЦА Ў ЛАТВІІ.

Частка латвійскае буржуазеі ўжо даўно насілася з думкай перарабіць Латвію ў манархію. Было некалькі камбінацый, якія выцякалі з розных арыентацый, а „арыентацыі" гэтыя мелі і маюць над сабой пэўныя эканамічныя інтарэсы латыскае буржуазеі ў розных краінах Эўропы.

Першая і самая моцная манархічная група арыентавалася і арыентуецца на Англію. Гэта група хоча, каб Латвія зрабілася каралеўствам з адным з ангельскіх прынцаў на чале.

Англія самая моцная марская дзяржава,—разважаюць яны,—яна лёгка можа абараніць Латвію, паслаўшы ў латвійскія гавані моцную эскадру і десант. Калі ў Латвіі будзе ангельскі прынц, дык у Латвіі будуць і грошы і ўнутраны спакой, бо, апіраючыся на Англію і ангельскага прынца, латыская буржуазея лёгка можа справіцца з працоўным рухам.

Другая група баіцца вельмі моцных уплываў ангельскага капіталу і банкаў, якія змогуць задушыць ня толькі рабочы рух у Латвіі, але вынясь халат і з латыскае буржуазеі, бо яна ня зможа канкураваць з ангельскімі прамысловцамі і купцамі. Гэта група зусім цьвярозая гавора, што ангельцы не дадуць латыскай буржуазеі нават быць сваімі камісыянэрамі, а проста захопяць увесь рынак і ўсю сторонку ў свае рукі. Таму гэта група шукае спосабу схаўрусавацца са Шведыяй і ўзяць да сябе прынца шведзкага.

Трэцяя група, у якую пераважна ўваходзяць немцы, марыць аб тым, каб дастаць для Латвіі нямецкага прынца. Тут даводзіцца і тое, што паміж двума народамі ўстанавілася і дагэтуль падтрымоўваецца моцная культурная і гандлёвая сувязь.

Усе гэтыя думкі адкрыта пачынаюць пашырацца ў прэсе, прычым асабліва выдзяляецца першая група, якая нават мела газэту на латыскай мове—„Piecі santimi" (Пяць сантымаў), якая зьмяшчала кіраўнічадэклярацыйныя артыкулы, інтэрв'ю і фатаграфіі «ідэёвых» латыскіх манархістаў.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Жанчын—на кіраўнічую працу.

БАБРУЙСК, 8-X. **У апошні час на пасаду старшыні Любаньскага райвыканкому вылучана жанчына-актывістка тав. Купрэява.** *Тав. Купрэява зьяўляецца першай жанчынай-старшынёй райвыканкому на Бабруйшчыне.*

Тав. Купрэява—дачка селяніна бедняка, з 12 гадоў пачала працаваць па найму. У апошнія часы працавала ў якасьці жан-арганізатара.

Апрача таго, **работніца заводу «Чырвоны Харчавік» тав. Магільнэр вылучана на пасаду акруговага інспэктара аховы мацярынства і младзенства.** *На заводзе тав. Магільнэр вяла актыўную працу сярод работніц.*

Полоччына не адстае.

ПОЛАЦАК, 8,X Пасьпяхова працягваецца падпіска на другую пазыку індустрыялізацыі.

На 1 кастрычніка г.г. праведзена падпіска на пазыку ў суме 374.595 руб. ці 131,4 проц. арыентыровачнай лічбы. Горад даў 132.100 р., служачыя, рабочыя транспарту 51000 р., вайсковыя служачыя 35810 і сельскай мясцовасьці 155685 р.

Па райёнам колькасьць падпіскі дае: Асьвейскі райён 12475 р. 113, 4 проц. Лепельскі 22200 р. 111 проц. Ветрынскі 18215 р. 107,15 проц. Вульскі 16030 р. 100,2 проц. Дрысенскі 15020 р. 100,13 проц., Расонскі 17835 р. 89,18 проц., Полацкі 30620 р. 78,51 проц., Валынецкі 12895 р. 71.64 проц., і Вушацкі райён 10395 р. 57,75 проц.

Выключна на сялян падае 13485 р. Апошняе кажа аб тым, што работнікі вёскі яшчэ недастаткова вядуць працу.

Сябры прафсаюзаў ахоплены на 70 проц.

З тэхнічнага боку кульгае несваечасовае афармленьне падпіскі.

Наогул-жа Полаччына не адстае.

МІХ.

Лік укладаў расьце.

(Бабруйск).

Перад пачаткам 1927-28 гаспадарчага году перад крэдытнай кааперацыяй Бабруйшчыны стаяла сур'ёзная задача—павялічыць колькасьць укладаў тавараў, шырока разгарнуць укладныя аперацыі. У сучасны момант ёсьць магчымасьць праверыць, наколькі справілася наша крэдытная кааперацыя з гэтай задачай. Колькасьць укладчыкаў на 1 жніўня 1927 году была роўна 339 і на 1 жніўня 1928 году лік укладчыкаў узрос да 986. Рост даволі значны, але трэба сказаць, што рост гэты стваравўся пераважна за лік розных арганізацый. Тое самае мы наглядаем і з сумаю ўкладаў.

За год сума ўкладаў з 49 тысяч павысілася да 260 тысяч рублёў, але тут 222 тыс. руб. зьяўляюцца ўкладамі розных арганізацый, якія зьяўляюцца ўкладчыкамі таварыстваў.

Што-ж перашкаджае пасьпяховаму прыцягненьню да ўкладной справы адзінаасобных сялян-гаспадароў і іх накапленьняў—укладаў? Адказ на гэта прыходзіцца шукаць у слабой аўтарытэтнасьці нашых крэдытных таварыстваў сярод сялянства, прычынаю чаму служыць няўмелая праца таварыстваў у гэтым напрамку, растраты укладных сродкаў, слабасьць растлумачальнай працы і г. д.

На будучы час крэдытнай кааперацыі Бабруйшчыны трэба выжыць гэтыя недахопы. Гэта наслужыць стымулам да большага росквіту ўкладаў нашых крэдытных таварыстваў.

Загатаўляем збожжа.

Віцебск, 6-X. У 1928-29 загатоўчым годзе дзяржаўным і кааперацыйным броварам, дражджовым заводам і млынам, па зацьверджанаму Наркамгандлем сьпісу, прадастаўлена права загатоўкі збожжа непасрэдна на заводах.

Памянёныя заводы і млыны маюць права загатаўляць толькі тыя культуры і ў той колькасьці, якая прадугледжана іх вытворчымі праграмамі, зацьверджанымі ВСНГ.

Колькасьць зярна, патрабная заводам, павінна быць пагоджана з Наркамгандлем БССР.

Арганізоўваем сялянскі тэхнікум.

Коханава, 8-X. Пэдагагічны савет Смальлянскай сельска-гаспадарчай школы ўхваліў арганізаваць нядзельны сялянскі тэхнікум, у якім будуць займацца выключна сяляне і батракі, працуючыя на сельскай гаспадарцы. Абслугоўваць тэхнікум будуць ня толькі настаўнікі, але і вучні старэйшага курсу, не атрымліваючы ад гэтага ніякай платы. Савецкія, грамадзкія і партыйныя арганізацыі Коханаўскага райёну павінны дапамагчы вучням Смальлянскай школы практычна ажыцьцявіць гэту задачу—стварэньня сялянскага тэхнікуму.

Сродкі ад самаабкладаньня—на пажарную ахову.

Ворша, 8-X. На акрузе ад сродкаў самаабкладаньня адлічана на пажарную справу 63 тысячы рублёў. За гэтыя грошы куплена 45 пажарных машын, 13 коняй для пажарных дружын, у чатырох райёнах пабудаваны пажарныя дэпо; у трох райёнах пажарныя вышкі, а таксама набыта вялікая колькасьць неабходных пажарных прылад.

Ашчадныя касы налічваюць 15000 укладчыкаў.

ГОМЕЛЬ, 8-X. У верасьні месяцы лік укладчыкаў у касах ашчаднасьцяў акрузе павялічыўся на 294, а сума ўкладаў—на 75 тысяч р. На 1-е кастрычніка касы ашчаднасьці абслугоўвалі 15 тысяч укладчыкаў, а сума ўкладаў дасягнула аднаго мільёна 76 тысяч 172 руб. Асабліва добра разьвівае працу **Дабруская каса ашчаднасьці пры фабрыцы „Герой Працы".** Здавальняюча працуюць касы ашчаднасьці: фабрыкі «Вязьвій» Рэчыцы, Церахоўкі. Адстаюць касы ашчаднасьці Камарынскага, Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага райёнаў.

Прэмія за лепшае распаўсюджваньне пазыкі.

ГОМЕЛЬ, 8-X. Учора конкурсная камісія абмеркавала вынікі рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Конкурсная камісія прысудзіла першую прэмію Рудне-Нісімковіцкаму сельсав., які выканаў заданьне ў разьмеры 75 проц. Кожны двор мае аблігацыю пазыкі. Сельсавету выдаецца прэмія ў 40 р.

2-я прэмія прысуджана Палескаму сельсавету, выканаўшаму заданьне поўнасьцю. Сельсавету выдаецца 35 р. 3-яя прэмія выдаецца Равенска-слабодзкаму сельсавету Рэчыцкага райёну, выканаўшы заданьне ў разьмеры 80 проц. Выдаецца 30 р. 4-ая прэмія ў суме 20 руб, прысуджана Рудзенецкаму сельсавету Ўраравіцкага райёну.

Апроч таго, конкурсная камісія пастанавіла прэміраваць контрагэнтаў Гулевіча, які рэалізаваў аблігацый пазыкі на 300 р. Дубоніна, які рэалізаваў пазыкі на 235 р. Першаму контрагенту выдаецца 20 р., а другому—15 р.

Рабочыя патрабуюць спыненьня продажу гарэлкі.

Ворша, 8-X. Рабочыя аршанскага лесапільнага заводу, па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі, на сваім агульным сходзе пастанавілі хадайнічаць перад акрпрафсаветам аб зачыненьні продажы гарэлкі ў краме № 8, Аршанскага ЦРК. На гэтым-жа сходзе—аднагалосна ўхвалілі, каб адміністрацыя выдавала зарплату п'юшчых рабочых толькі іх жонкам.

КАЛГАСЫ РАСТУЦЬ.

БАБРУЙСК, 6-X. Ад часу з 1 сакавіка па 1 верасьня бягучага году на Бабруйшчыне з'арганізавана 55 калектыўных гаспадарак з якіх 35 беларускіх, 19 яўрэйскіх і 1 польскі.

Гэтыя калгасы яднаюць у сабе 396 сямей і займаюць плошчу зямлі ў 2392 гэктары.

З агульнай колькасьці арганізаваных за гэты час калгасаў 13 арганізавана на надзельных землях.

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД.

ВІЦЕБСК, 6-X. Селянін вёскі Куляціна, Сутокскага сельсавету, Лёзьненскага райёну, **ЗЬВІРБУЛЬ ЯКУБ,** вылучаны для працы па пазыцы контрагентам, за **АДЗІН ДЗЕНЬ САБРАЎ ПАДПІСКУ СЯРОД СЯЛЯН НА 150 РУБ.**

ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА.

Барысаў, 8-X. Паступленьне с.-г. падатку першай раты праходзіць слаба. Шасьць с.-с. Аздаяцінкі, Бродаўскі, Бытчанскі, В. Стахаўскі, Глівенскі і Забашэўскі выканалі першы тэрмін своечасова. На 5 кастрычніка ўзыскана па райёну с.-г. падатку 28882 руб. 89 к.

Шэраг с.-с. напрыклад, Вяляціцкі, Жыцькаўскі, Зачыскі і іншыя нядбайна адносяцца да ўзысканьня с.-г. падатку. Некаторыя с.-с. амаль што зусім не прыступілі да працы.

СКЛАДЗЕН АКРУГОВЫ БЮДЖЭТ.

Бабруйск, 5-X. Скончана складаньне мясцовага акруговага бюджэту. У прыбытковай частцы бюджэт бягучага гаспадарчага году мае 715200 рублёў і ў выдатковай частцы 6489011 руб. Супроць мінулага году ёсьць павялічэньне па прыбытках на 9,3 проц. і па выдатках—на 6,4 проц.

З Чырвонай арміяй--міліёны рабочых і сялян.

(Малюнак з натуры)

7-га кастрычніка зранку працоўныя Менску рыхтаваліся да спатканьня сваёй надзейнай варты Чырвонай арміі...

Куды ні кінеш вокам — усё кветкі і кветкі самых рознастайных колераў.

Букеты кветак можна было бачыць у руках работніцы, у руках служачай і нават у руках старога рабочага.

Ня толькі з кветкамі спатыкаў працоўны Менск чырвоных байцоў:—кожны калектыў, кожная невялічкая ячэйка рабочых і служачых падрыхтавала сваім падшэфным часткам падарункі.

Па вуліцах гэтулькі народу, колькі бывае ў вялікія рэвалюцыйныя сьвяты, калі пралетарыят выходзіць дэманстраваць сваю моц.

Ад рогу Ленінскай па Савецкай уверх абапал выстраіліся шэрагі прафэсыйных арганізацый.

Аркестры музыкі бадзёрымі маршамі ўздымалі і без таго ўзьняты настрой тысяч сустракаўшых.

Вось з-за рогу вуліцы Энгельса на Савецкай паказаліся першыя атрады чырвонай коньніцы. Магутнае УРА было першым прывітаньнем байцам...

Тысячы вачэй сачылі за тым, як, варочаючыся з баявой вучобы, набліжаліся атрады Чырванай арміі...

Не пасьпела перадавая частка ўехаць паміж шэрагаў працоўных як гучнае УРА пакацілася па Савецкай вуліцы. Байцоў засыпалі кветкамі, ім перадавалі падарункі.

Вось едзе чырвоны камандзір, работніца падае яму букет з розных кветак. Баец вачыма дзякуе, а яму ўжо падаюць другі букет.

Камандзір перадае кветкі чырвонаармейцу.

— Няхай жыве Чырвоная армія!

— Няхай жывуць чырвоныя байцы!

Гэтыя воклікі гучна прарэзвалі паветра, ня сьціхаючы.

Вось едзе чырвонаармеец з вялікім букетам кветак. Ён ветліва ўлыбаецца і жартуе з сваім суседам...

А кветкі ўсё сыплюцца і сыплюцца на чырвоных байцоў.

Па тварах байцоў відаць, што ў баявой падрыхтоўцы яны экзамен вытрымалі з гонарам.

А УРА і прывітаньні ня спыняюцца...

Гэта найяскравей даводзіла, што Чырвоная армія не адна, а што з ёю ў патрэбны момант будуць міліёны рабочых і сялян вялікага Саюзу працоўных...

В. З—ў.

„Дзень Ураджаю"—падлік дасягненьняў.

Зусім яшчэ маладое грамадзкае сьвята «Дзень Ураджаю» ў краіне Саветаў з кожным годам пускае глыбей і глыбей свае карэньні ў новы быт вёскі. Толькі некалькі гадоў таму назад «Дзень Ураджаю» амаль што насіў яшчэ характар сьвята сялянскае моладзі. Але з году ў год «Дзень Ураджаю» набыў сабе шырока-грамадзкае аблічча.

Восень кожнага году нясе новы ўраджай, які асабліва ў нашай сельска-гаспадарчай краіне адыгрывае галоўную ролю ў дабрабыце краю. У залежнасьці ад ступені вышыні ўраджаю, мы разгортваем на бліжэйшы час свой гаспадарчы і культурны рост.

У гэтым годзе сьвята «Дню Ураджаю» павінна прайсьці пад лёзунгам хэмізацыі сельскае гаспадаркі для падвышэньня ўраджайнасьці, у выніку чаго надзвычайна яскрава павінна быць паказана роля мінэральных угнаеньняў у справе падвышэньня ўраджайнасьці. Дзеля гэтага заклікаецца прыняць шырокі ўдзел у правядзеньні сьвята АДА-Авіяхім, які на фоне шырокай народнай ураджайнасьці яскрава пакажа свае дасягненьні на экспанатах, а ўсяго сялянства. Патрэбна правесьці падрыхтоўчую працу так, каб сходы адбыліся ва ўсіх вёсках, пасёлках, хутарох— з растлумачэньнем важнасьці «Дню Ураджаю» ў справе палепшаньня гаспадаркі праз азнаямленьне з дасягненьнямі культурных гаспадарак.

На с.-г. выстаўцы неабходна падкрэсьліць экспанатамі спосаб падвышэньня ўраджайнасьці. Роля мінэральных угнаеньняў, зерначышчэньня, палепшанай с.-г. машыны, торфу, лубіну, ужываньня шматпалёвага севазвароту ў справе падвышэньня ўраджайнасьці—павінна замацоўвацца належнымі вынікамі з досьледаў культурных гаспадарак, сялян-дасьледчыкаў, калектыўных гаспадарак, савгасаў і г. д.

У мінулыя гады, калі сьвята «Дню Ураджаю» амаль што было выключна сьвятам моладзі, калі нашы мерапрыемствы па ўздыму сельскае гаспадаркі толькі яшчэ разгортваліся, тады магло лічыцца дасягненьнем тое, што асобныя сялянскія гаспадаркі пачыналі сеяць карнавыя травы, карняплоды, лубін на зялёнае ўгнаеньне, ужываньне мінэральных угнаеньняў і г. д. Цяпер гэтага мала. Наша праца на вёсцы па ўздыму сельскае гаспадаркі налічвае шмат гадоў і вынікі яе павінны быць большымі і адбівацца на выстаўцы выразна. Тая гаспадарка, якая будзе прэміравана, павінна паказаць ня толькі вынік сваёй працы і дасягненьняў за адзін год, але і дасягненьні за ўсе гады савецкага будаўніцтва па ўсіх галінах гаспадаркі, палявадзтву, садоўніцтву, гароднічству, жывёлагадоўлі, машынізацыі, сувязі з кааперацыяй.

Сёлета выстаўкі будуць праведзены 14 кастрычніка ў дзень «Сьвята Ураджаю». Значэньне выстаўкі, як школы вывучэньня шляхоў палепшаньня гаспадаркі, надзвычайна вялікае, але пры ўмове правільнай яе арганізацыі. Вопыт мінулых гадоў паказаў, што найлепш дасягае выстаўка свае мэты пры наступных умовах:

Калі ў арганізацыі яе прымаюць удзел усе мясцовыя працаўнікі, настаўніцтва, камсамольцы, а таксама і мясцовыя ўстановы і арганізацыі; калі сялянскія экспанаты рыхтуюцца загадзя, калі ў часе выстаўкі тлумачэньні па экспанатах даюць самі сяляне; калі на выстаўцы паказваецца праца асобных сельска-гаспадарчых машын і прыладаў; калі на выстаўцы побач з экспанатамі па сельскай гаспадарцы паказваюцца экспанаты прамысловасьці; калі побач з сялянскімі экспанатамі выступаюць на выстаўцы экспанаты саў гасаў, калгасаў, дасьледчых станцый; калі прэміі прысуджаюцца за лепшыя экспанаты з удзелам сялян і зараз-жа выдаюцца.

Зразумела, што агульнымі сіламі шэфскіх арганізацый, камсамольскіх ячэек, прафэсыянальных арганізацый, настаўніцтва, сельска-гасп. гурткоў можна добра пабудаваць сельск. гасп. выстаўку і пасьпяхова правесьці сьвята «Дню Ураджаю».

П. Заяц.

Што ўвозіцца ў Польшчу.

Варшаўская санацыйная газэта «Глос Працы», абгаварваючы дэфіцытны гандлёвы балянс Польшчы, які ў працягу гэтага году зусім стабілізаваўся, пералічвае, якія тавары і на якую суму яны ўвозяцца ў Польшчу.

Між іншым, калі яшчэ ішла толькі гутэрка аб зямельнай рэформе і парцэляцыі маёнткаў, абшарнікі паднімалі вроді гэтага страшэнны гвалт і даказвалі, што тады загіне земляробская культура, гарады будуць галадаваць бо-ж сяляне не дадуць на рынак столькі збожжа, сколькі даюць «культурныя», маёнткі; Польшча-ж будзе як заўсёды вывазіць, купляць збожжа і муку заграніцай і г. д.

І вось зямельная рэформы не правялі, абшарнікі гаспадараць у «культурных» маёнтках і што-ж аказваецца?

Польшча прывозіць збожжа з-заграніцы і нават на вялікія сумы. Так у працягу 7-мі месяцаў: студзень-ліпень 1927 г. увезена на 190.386 тыс. злотых, у той час як вывезена ўсяго на 19.182 тыс.

За той-жа час 1928 г. прывезена на 154.758 тыс. зл., а вывезена на 21.831 тысяч.

Увоз перавысіў вываз у сярэднім больш як у 8 разоў.

З гэтага відаць, што ў на 80 проц. земляробскім краі штосьці неўпарадку, бо дзе-ж тое збожжа з «культурных маёнткаў?

Праўда, за васеньнія месяцы апошніх гадоў больш вывезена збожжа чым прывезена, але-ж гэта пераважна сялянскае збожжа, якія прыціснутыя падаткамі вывозяць яго на рынак, не чакаючы на лепшую цану вясною, што могуць рабіць абшарнікі, якія ў любы момант атрымліваюць пазыкі на зварот. Дробныя-ж сялянскія гаспадаркі гадуюць і прадаюць кароў і сьвіней, што вывозяцца заграніцу і гэтым часткова латаецца дзяржаўны бюджэт Польшчы.

Вывозіцца лён, яйкі—прадукты працы і гадоўлі тых-жа дробных «нязкультурных» сялян.

Цяпер паглядзім, што прывозіцца з заграніцы, на што трацяцца гэныя атрыманыя за быдла, лён, яйкі і масла грошы?

Прывезена за той-жа сямімесячны працяг часу на 87 млн. злустасьці—амэрыканскай саланіны ў той час, калі адсюль вывозяцца тысячы жывых сьвіней заграніцу. На 160.879 тыс. прывозіцца сырых і выробленых скур, дарагіх аўчынак і рознай лякераванай і шаўровай скуры.

Як відаць, прывозіцца пераважна тое, чаго сялянска работніцкія масы ніколі ня купляюць—значыць грошы трацяцца на патрэбы і капрызы багачоў капіталістаў.

Па меры таго, як капіталісты багацеюць, дзякуючы непамернаму вызыску і эксплёатацыі сялян і работнікаў, з кожным годам павышаецца і прывоз гэтых, патрэбных ім тавараў.

Так, напрыклад, у 1926 годзе прывезена было аўтамабіляў на 14 мл. зл., у 1927 г.—на 37. мл., а за 7 мес. 1928 г.—на 64 мл.

Таксама стаіць справа із футрамі, вінамі, амэрыканскай мукой, парфумамі, шоўкам і г. д.

Прывоз павялічваецца, у той час як вывоз, калі не зьмяншаецца, дык стаіць на адным роўні, бо сялянскія масы, пазбаўленыя ў большасьці вартштатаў працы—зямлі, ня маюць магчымасьці разьвівацца, ня маюць магчымасьці на 2-3-х дзесяцінах весьці інтэнсыўную і рацыянальную гаспадарку.

Дзякуючы ўвозу на вялікія сумы непатрэбных для шырокіх мас тавараў, Польшча кожны год мае дэфіцытны гандлёвы балянс і мусіць даплачваць заграніцу, вядома-ж, золатам, ці далярамі з агульна-дзяржаўнае касы.

Да гэтага часу ўжо больш мілярду залатовак выкінута на пакрыцьцё гэтага дэфіцытнага балянсу.

А скуль-жа і ад каго бярэцца гэтыя міліярды, якія трацяцца на куплю аўтамабіляў, вінаў, шоўку і г. д.?

Вядома-ж з падаткаў ад сялян і работнікаў. Праўда, падаткі бярэцца і ад абшарнікаў, купцоў, фабрыкантаў, але-ж апошнія маюць магчымасьць і перакідваць іх на тых-жа працоўных: абшарнік паднімае цану на дровы, лугі, за пасьбішча; купец паднімае цэны на тавары, фабрыкант зьмяншае плату работнікам, або таксама павышае цану тавараў і ўрэшце—аніводнага гроша з іх кішэні ня ідзе ў дзяржаўную касу—усё валіцца на каркі тых-жа працоўных.

Р. П.

КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА РАЗГАРАЕЦЦА.

Падзеі, якія ў працягу апошніх дзён разгортваюцца перад нашымі вачыма ў краінах капіталу, поўны глыбокага і вельмі навучальнага ва ўсіх адносінах значэньня. Сьледам за так дружна праходзячай забастоўкай тэкстыльшчыкаў поўначы Францыі, забаставалі 50000 суднабудаўнікоў Нямеччыны—у партох Гамбургу, Брэмэна, Кіля, Штэціна і Данцыга. Прычыны забастоўкі тыя самыя, што і на поўначы Францыі. Гэта патрабаваньне павышэньня зарплаты, патрабаваньне, у здавальненьні якога адмаўляюць сваім рабочым і нямецкія капіталісты. Адначасова з гэтым забаставалі 27000 гарнякоў Сілескага райёну, якія таксама патрабуюць 15-ціпроцантнай надбаўкі да сваёй зарплаты.

Але гэта яшчэ ня ўсё. У райёне Мюнхэн—Гладбах уласьнікі тэкстыльных фабрык абвясьцілі лёкаут і зачынілі свае фабрыкі, выкінуўшы на вуліцу больш як 50 тысяч тэкстыльшчыкаў і тэкстыльшчыц. Прычына лёкаўту—адмаўленьне рабочых аднавіць нявыгадны для іх дагавор аб зарплаце. У шэрагу нямецкіх гарадоў, як у Гамбургу і Бэрліне адбываюцца крывавыя сутычкі з паліцыяй і льлецца кроў.

Усе гэтыя падзеі ясна паказваюць, што і ў рэспубліцы Гіндэнбурга адбываецца сярод рабочай клясы нейкі ўнутраны пералом, заўважваецца рух улева да больш вернага рэвалюцыйнага шляху.

Бурна расьцьвёўшы за апошнія гады, нямецкі капіталізм прагна шукае выхаду на больш выгодную сусьветную арэну для сваёй дзейнасьці. Але бязьлітасныя шляхі «справядлівага» Версальскага міру, плян Дауэса, франка-ангельская акупацыя Рэйнскіх правінцый і фінансавыя прэтэнзіі былой Антанты закрываюць яму шляхі, прымушаюць яго карыстацца толькі сваімі ўласнымі сродкамі. З другога боку, набліжаюцца тэрміны вельмі буйных выплат саюзьнікам, а плаціць з сваёй уласнай кішэні нямецкім капіталістам няма, зразумела, ніякай ахвоты. Пралетарый масамі гінуў на імпэрыялістычных франтох, пралетарый павінен і зараз сваім гарбом выплаціць да апошняй капейкі кантрыбуцыю французам і ангельцам.

Так разважаюць нямецкія капіталісты і адпаведна гэтаму дзейнічаюць: павялічваюць, дзе можна, працоўны дзень, спрабуюць усюды, дзе толькі можна, зьменшыць іх зарплату. Такім спосабам яны спадзяюцца, не зьмяншаючы, а, наадварот, павялічваючы свае прыбыткі, потам і крывёю сваіх рабочых выплаціць шматмільярдны доўг саюзьнікам. Між тым жыцьцё ўсюды даражае, рабочаму з кожным днём усё цяжэй і цяжэй пражыць на свой заработак. Ім застаецца адзіны шлях, адзіны выхад: забастоўка і рэвалюцыйная барацьба за сваё права на жыцьцё, за сваю лепшую будучыню. Гэты сродак, гэты шлях яны і выбіраюць.

А між тым, як нам вядома, у нямецкай буржуазнай рэспубліцы знаходзіцца зараз ля ўлады, выбачайце за выраз, „сацыялістычны" ўрад. Здавалася-б, чаго-ж яшчэ жадаць. Вось дасканалае здарэньне давесьці на справе сваю адданасьць рабочай клясе, усю правільнасьць свайго лёзунгу: «міру ў прамысловасьці».

Але дзіўныя, вельмі дзіўныя паводзіны паноў «сацыялістычных» міністраў гіндэнбургаўскай рэспублікі. У той час, калі нямецкі пралетарыят пухне з голаду і ў роспачы бастуе, „сацыяліст" Мюльлер займаецца вясёлай балбатнёй з Брыянам. У Жэневе, у той час, калі 50 тысяч тэкстыльшчыкаў Мюнхэн—Гладбахаўскага райёну выкідаюцца абнагледзёшымі гаспадарамі фабрык на вуліцу, у той час, калі сапраўдны сацыяліст павінен быў-бы весьці барацьбу і стаяць на чале руху, нямецкія «сацыял-дэмакраты», якія стаяць ля ўлады, марыць пабудаваць браняносец для абароны буржуазнай капіталістычнай бацькаўшчыны.

Характэрнай асаблівасьцю нямецкіх забастовак зьяўляецца тое, што ў руху прымаюць удзел вялізарныя масы неарганізаваных у прафсаюзы рабочых, што гэтыя неарганізаваныя рабочыя ідуць зараз у забастоўках сьледам за нямецкай кампартыяй, сьледам за нямецкімі рэвалюцыйнымі прафсаюзамі. Гэта вельмі важная акалічнасьць, і вось чаму можна толькі вітаць рашэньне левай меншасьці арганізаваць асобны стачачны камітэт для неарганізаваных рабочых, які кіраваў-бы іх дзейнасьцю, які мэтадычна прывучаў-бы іх да рэвалюцыйнай барацьбы з буржуазеяй.

Гэта ў Нямеччыне. Але хвалі рэвалюцыйных забастовак коцяцца па ўсёй капіталістычнай Эўропе, захапляюць нават Амэрыку і Аўстралію. Не гаворачы ўжо аб Францыі, дзе колькасьць бастуючых тэкстыльшчыкаў поўначы ўсё павялічваецца, дзе адбываюцца крывавыя сутычкі з паліцыяй, дзе ня спыняюцца непаладкі сярод рэзэрвістаў і дзе з дню на дзень можна чакаць вельмі сур'ёзнай забастоўкі гарнякоў,—не гаворачы ўжо пра Нямеччыну бастуюць і докеры ў далёкай Аўстраліі і тэкстыльшчыкі Нью-Бэдфорду (Паўночна - Амэрыканскія Злучаныя Штаты). Абвешчана забастоўка лёдзінскіх тэкстыльшчыкаў.

І што асабліва цікава, што асабліва трэба адзначыць і не забываць, дык гэта тое, што **забастоўкі носяць ня толькі эканамічны характар** (павышэньне зарплаты), **але і глыбока палітычны.** Гэтыя забастоўкі праходзяць пад лёзунгам абароны СССР, яны зьяўляюцца нібы манэўрамі, якія рыхтуюць яго да будучых яшчэ больш цяжкіх і крывавых боек.

Магутна грае чырвоны гарніст свой сыгнальны заклік да ўсеагульнай атакі на буржуазею... Расьце ўгныб і ўшыр шматмільённы чырвоны фронт байцоў за сусьветную рэвалюцыю, за пралетарскую волю... клясавая барацьба разгараецца.

І працоўныя масы Савецкага Саюзу з глыбокай увагай і з гарачым спачуваньнем будуць сачыць за гэтай тытанічнай барацьбой заходняга пралетарыяту.

Н. Бяліна-Падгаецкі.

На барацьбу са шкоднікам

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Грамадазнаўства і грамадзка-карысная праца школы.

Сувязь грамадзка-карыснай працы школы з грамадазнаўствам нельга разумець у тым сэнсе, што яна (праца) праводзіцца выключна адным настаўнікам-грамадазнаўцам і толькі на падставе грамадазнаўчага матар'ялу. Пытаньне аб грамадзка-карыснай працы школы—вельмі важнае і складанае. Грамадзка-карысная праца школы можна ажыцьцявіцца толькі ўсёй школай на падставе агульна-вучэбнага матар'ялу школы. Гэта значыць, што калі вы арганізуеце выхад у падпэфную ўстанову, то вы скарыстоўваеце грамадазнаўца для дакладу аб міжнародным становішчы, прыродазнаўца—для дакладу аб тэй ці іншай зьяве прыроды, выкладчыка сьпеваў, фізвыхаваньня і моў—для арганізацыі, разам з вучнямі, літаратурна-мастацкай часткі.

У сувязь грамадзка-карыснай працы з грамадазнаўствам у даным выпадку трэба разумець, з аднаго боку, у тым, што грамадазнаўца грае актыўную ролю ў арганізацыі гэтага выхаду, а з другога боку—грамадазнаўца разьвязвае ў працэсе грамадазнаўчай працы пытаньні клясавай барацьбы, вывучае пытаньні быту рабочых і сялян, узьняць іх культурны ўзровень.

Грамадазнаўца завастрае пытаньне перад вучнямі, што ў сучасны момант абмежаваецца адным толькі вывучэньнем акаляючага жыцьця і грамадзкай працоўнай дзейнасьці людзей нельга, а што трэба яшчэ прыняць актыўны ўдзел у гэтым жыцьці. Разам з гэтым падкрэсьліваецца, што ўсяго гэтага можна дасягнуць праз грамадзка-карысную працу школы.

Пытаньне грамадзка-карыснай працы школы яшчэ ні тэарытычна, ні практычна не распрацована. З гэтай прычыны кожная школа прыходзіцца абіраць аб'екты грамадзка-карыснай працы і праводзіць гэту працу агульнымі сіламі (вучняў і настаўнікаў) школы, ня ўвязваючы яе з праграмай, але абавязкова прадугледжваючы яе агульным плянам працы школы.

Аб'ектамі грамадзка-карыснай працы для гарадзкой школы (навакол школы) могуць быць:

1) праца сярод бацькоў, 2) дапамога бедным і акадэмічна-адсталым вучням школы, 3) шэфская праца, 4) прапаганда каапэрацыі, 5) праца па лініі Гарсавету ў галіне статыстыкі і дасьледваньня тых ці іншых галін гарадзкога жыцьця і г. д.

Ні ў якім разе нельга падзяляць грамадзка-карысную працу на працу вучняў і працу настаўнікаў. Грамадзка-карысная праца павінна зьяўляцца працай наогул школы. Такі падзел можа быць дапушчан толькі ў працэсе ўжо самой працы, напрыклад: вучні праводзяць працу па арганізацыі лікпунктаў (вярбуюць непісьменных, вядуць запісы і г. д.), а настаўнікі ўжо праводзяць самую ліквідацыю і абавязкова ўцягваюць у гэту справу вучняў старэйшых клясаў сямігодкі, а тым больш дзевяцігодкі, даручаючы ім працу пад сваім наглядам.

Нельга сабе і ўявіць грамадзка-карысную працы вучняў без кіраўніцтва гэтай працай настаўнікам. Грамадзка-карысная праца павінна праводзіцца вучнямі абавязкова пад кіраўніцтвам і непасрэдным удзелам настаўніцтва школы.

У грамадзка-карысную працу павінны быць уцягнуты ня толькі настаўніцтва, а праз настаўніка, пад яго кіраўніцтвам і адказнасьцю, павінна быць уцягнута ўся вучнёўская маса, якой мы павінны даць магчымасьць у працэсе працы выхоўвацца і набываць як працоўныя навыкі, так і навыкі грамадзкага дзеяча.

Л. Шашкоў.

„Для пользы дела".

(Бабруйск).

Гэтак у часе ўкамплектаваньня гарадзкіх школ лёзунгаваў інспэктар гарадзкіх школ Мароцкі, бегаючы з гарнаведу ў інспэктарыят. Пачуўшы гэты лёзун, настаўнікі прызадумаліся пачалі прагледаць сваю дзейнасьць за мінулы год: ці ўсё, як кажуць, упаладу. Рантам «для пользы дела» сталі вылятаць «у вырай» адзін за другім настаўнікі.

Першымі зусім выдецелі тыя настаўнікі, якіх грозны інспэктар прыняў напрыгодным. Шмат настаўнікаў выдецелі на ваколіцу гораду—настаўнікі са зьменшанай зарплатай. Рэшта-ж настаўнікаў, што ў гусьце інспэктара, не турбавалася, а сядзела на сваіх мясцох і дзівалася моцы грозвага інспэктара. Прычын для звальненьня і перакідваньня настаўніка ў інспэктара ня было, а біраваўся Мароцкі хлусьлівымі даносамі. Затое інспэктар устроіў у школе сваю жонку і жонку добрага свайго знаёмага—абедзьве ў мінулым годзе не працавалі.

Скончыўшы, як кажа пагаворка—«тая-сяк, наўскасяк, абы не палодзку»—укамплектаваньне школ, інспэктар Мароцкі рыхтаваўся адпачываць на лаўрах, як над ім загрымеў гром: умешалася ў справу ўкамплектаваньня школ інспэкцыя працы і добра ўдэрла Мароцкаму нос, даказаўшы яму поўную бязгрунтоўнасьць масавага звальненьня настаўнікаў, і паставіла звольненых настаўнікаў зноў на працу.

Цяпер усе аднае думкі, што лёзунг інспэктара Мароцкага праводзіўся не «для пользы дела». Натуралісты.

За нармальны навучальны год.

(Полаччына).

Шмат ёсьць прычын, што перашкаджаюць нармальнай працы школ, і яго іх не малаважную ролю грае само памяшканьне, асабліва, калі яно адпавядае сучасным вытворчым запатрабаваньням. Дзіўна, але яно так.

Возьмем для прыкладу панава пабудаваныя школы, альбо прыстасаваныя панскія палацы. Першыя недастатково абсталяваны, а пошнія ўжо сталыя, але як тыя, так і другія патрабуюць шмат апалу, параўнаўча з тымі сялянскімі халупамі, што наймаюцца над школу. З прычыны гэтага, тэй нормы апалу, якая адпушчаецца такім школам, не хапае, і яны ў сярэдзіне навучальнага году спыняюць заняткі. Гэта-б яшчэ не бяда, калі-б гэта зрабіла школа прынцыпова, але куды горш, калі спыняе заняткі з-за адсутнасьці апалу сямігодка, ды яшчэ робіць гэта разоў два альбо тры за зіму, ды кожны раз на тыдню. Тут ужо маўчаць нельга. У такіх выпадках абвінавачаюць загадчыка школы за дрэннае гаспадараньне, але ён тут менш за ўсё вінаваты.

Наколькі такое становішча пагражае скарацыць і без таго кароткі навучальны год, пашырэньня якога мы дабіваемся ўпартай працай сярод насельніцтва, адпаведным РВК трэба пытаньне з апалам урэгуляваць, прыязуўшы пад увагу ня толькі лік печак, але і аб'ём памяшканьня; калі-ж і гэта ня дасьць належных вынікаў,—паставіць пытаньне перад адпаведнымі савецкімі органамі аб павялічэньні нормы апалу для такіх школ.

Лік новых школьных будынкаў расьце з кожным годам, і на іх трэба больш зьвярнуць увагі. Пытаньне гэта ставіцца амаль што на кожнай настаўніцкай канфэрэнцыі, але яно ня вырашана і да сёньняшняга дню.

Ул. Мятла.

Беднату затрымаем у школе.

(Юравічы, Мазыршчына).

Каб даць магчымасьць бяднейшым вучням Юравічкай сямігодкі рэгулярна наведваць школу, РВК заказаў цёплую вопратку на зіму на некалькі асоб. Нягледзячы на кватэрны крызіс (школа мае ўсяго 6 пакоў на 10 груп), рыхтуецца адчыненьне інтэрнату.

Месяца праз паўтара будзе закончан будынак для малодшых груп сямігодкі, які будзе бліжэй да асноўнай масы дзяцей.

Да гэтага году мы ня мелі падручнікаў у школе, каб імі забясьпечыць дзяцей беднаты, а ў гэтым годзе агульная забясьпечанасьць беднаты падручнікамі—80 пр.

Трэба спадзявацца, што пры такіх практычных захадах можна будзе выйсьці к канцу школьнага году бяз стратаў, затрымаўшы беднату ў школе.

Некаму заплаціць сяброўскія ўзносы.

(Клімавіцкі р., Магілёўшчына).

Вось ужо прайшоў цэлы месяц, як у гор. Клімавічах адбылася рэйонная канфэрэнцыя саюзу прац. асьветы. Побач з іншымі пытаньнямі, стаяла справаздачасьць райвясцкому аб гадавой саюзнай працы. У крытыцы па справаздачасьці адбіваліся слабыя моманты працы мясцкому па ўсіх галінах саюзнага жыцьця асьветнікаў. Стары мясцком папракалі ў парушэньні пляванасьці, у адсутнасьці саюзнай дысцыпліны, у слабасьці культ-асьветнай працы, тарыфна-эканамічнай, па аховe працы, у справе абароны прававога становішча асьветнікаў, што з боку мясцкому навіралася «падхлебніцтва» да адміністрацыі і інш. Урэшце, з захаваньнем поўнага прынцыпу дэмакратызму, зрабілі перавыбары райвясцкому, у склад якога прайшлі новыя сілы і здольныя да працы.

Здавалася-б, што новы склад мясцкому зьявіцца штурхачом да зьніжэньня ўсіх адмоўных бакоў працы, стала возьмецца за выкананьне дадзеных дырэктыў і стане сапраўдным арганізатарам масавай саюзнай працы. Але факты кажуць зусім іншае. Працы райвясцкому аб сёньня яшчэ няма. Вылучылі адказнага сэкратара і толькі... За цэлы месяц бадай што не адбылося ніводнага пасяджэньня. Калі зойдзеш у канцылярыю мясцкому, дык апрача сьцепак, ды сумна падпіраючых іх вясковых настаўнікаў, прыпоўшых за розными справамі, ня ўбачыш ніводнага сябра мясцкому, нават некаму заплаціць сяброўскія ўзносы.

Дык вось адкуль ісходзе парушэньне саюзнай дысцыпліны і розныя хібы масавай працы. Па-мойму, гэта ёсьць ігнараваньне давер'ем саюзнай масы і нядбайнасьць да справы. Асьветнікам гэтак працаваць сорамна.

Вясковы член м-на ШЫНГАРОЎ.

Адным—сьмех, другім—сьлёзы.

(Аб разьмеркаваньні лекцый сярод настаўнікаў.

У адным з папярэдніх нумароў газэты «Савецкая Беларусь» настаўнік з гор. Рагачэву закрануў цікавае і вельмі распаўсюджанае пытаньне аб разьмеркаваньні лекцый сярод настаўнікаў сямігодак.

Перагрузка адных і недагрузка ў залежнасьці ад гэтага другіх назіраецца ня толькі ў Рагачэве. Некалькі год таму назад, калі БДУ ня мог даць у патрэбнай колькасьці настаўнікаў для старэйшых канцэнтраў, назіралася тое, што ў гарадох некаторыя выкладчыкі мелі па 40-42 гадз. ў тыдзень і бегалі з аднае школы ў другую, мала зварачваючы ўвагі на якасьць працы. Але ў мінулым 1927-28 г. і сёлета такіх зьявішчаў магло-б ужо і ня быць.

На вялікі жаль, пэдфакаўцы вельмі цяжкі на пад'ём да вясковых школ і ў большасьці атрымліваюць прызначэньні ў буйныя ці дробныя гарады, вясковыя-ж сямігодкі застаюцца без належнага штату і кваліфікаванай сілы. Таму там і назіраюцца такія выпадкі, калі адзін прадмет разьмяркоўваецца між трыма выкладчыкамі (гэта назіралася ў некаторых сямігодках Аршаншчыны), а загадчык школы прымушаны браць, апрача загадваньня, 27-30 гадзін.

Вельмі шкадліва адбіваецца на нагрузцы адчыненьне раўналежных груп, гэта прымушае настаўнікаў нагружацца «да адказу». Такім чынам, перанагрузка—зьявішча нармальнае ў райёнах, выклікаецца жыцьцём, і Акруговым Інсп. Асьветы і саюзным органам пара заняцца ліквідаваньнем такога становішча.

Другога роду перанагрузка выклікаецца ўжо іншымі матывамі.

Возьмем Амсьціслаў. У гэтым годзе тут праведзена шэраг камбінацый дзякуючы жаданьням ранейшага райінспэктара асьветы. Яго па некаторых прычынах вызвалілі ад працы. З гораду ехаць яму не захацелася. І вось робіцца ператасоўка: каб даць яму належную нагрузку, з аднэй сямігодкі пераводзіцца ў малодшы канцэнтр яўрэйскай школы на белмову выкладчык хэміі, з другой 7-кі ў V-ю даюць для нагрузкі новага выкладчыка, а былы інспэктар атрымлівае ў другой 7-цы яго лекцыі па геаграфіі (гэты інспэктар і ў мінулым годзе таксама «нагружаўся», апрача інспэктарскай пасады, лекцыямі ў сямігодцы). Для нагрузкі і ў Амсьціслаўлі падзяляюць некаторыя прадметы на некалькі частак між выкладчыкамі. Праўда, у некаторых школах яно патрэбна, а ў некаторых гэта—роскаш. Саюз і інспэктура маўчаць.

Хочацца абгаварыць і яшчэ адно вельмі балючае пытаньне па школах, якое грае немалую ролю ў пераводах, а іншы раз і ў звальненях настаўнікаў. Я хачу закрануць пытаньне аб жонках адказных працаўнікоў і наогул аб жонках настаўнікаў-настаўніцах. Часта назіраюцца перакідкі адказных працаўнікоў, жонкі якіх настаўніцы. Вядомая справа, што яна патрабуе на законнай падставе пераводу таксама да мужа і абавязкова ў горад ці ў мястэчка, каб жыць разам. А не заўсёды ёсьць вольныя месцы. І пачынаецца канцель: шукаюць матывы да перакідак «неадказных» ці «мала адказных», верпяцца і так і сяк. І перавод скамбінуюць. У такіх выпадках і саюз кудысьці змываецца, маўчыць, бо часта і там патрэбна бывае «устройць» роднага чалавечка. Іншы раз ня ведае настаўнік такіх манэўраў, пераедзе на новае месца, а тут ужо зноў перарабілі па другому, і пачынаецца непаразуменьні і злоба.

Тое-ж і з жонкамі настаўнікаў: пераводзіцца ці прызначэнне настаўнік, давай там-жа месца і яго жонцы. Ма'быць хутка ўсе школы так і будуць укамплектоўвацца: рыхтуеш пасаду для скончыўшага пэдфак ці пэдтэхнікум, авансам рыхтуй і для яго жонкі. Гэта быццам неяк і сьмешна, але такі сьмех часта ператвараецца для некаторых у сьлёзы.

Амсьціслаў. Зн—ы.

НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

На заметку «ІНСПЭКТАР З МАШЫНІСТКАЙ» («Сав. Беларусь» № 193) памочнік пракурора па 2 вуч. Аршанскае акругі паведамляе:

Заметка «Інспэктар з машыністкай» мной праверана праз Дрыбінскі РВК, пры чым з атрыманага на гэтаму пытаньню матэрыялу відаць, што гэты факт быў вядомы акруговаму Інспэктару Нар. Асьветы пры прызначэньні Каліноўскага на пасаду інспэктара па Дрыбінскаму раёну, але мелася на ўвазе, што ён у самым хуткім часе аўладае белмовай. Паколькі на сутнасьці быць райінспэктарам Нар. Асьветы без уладаньня белмовай немажліва, акруг. інспэктарыят устанавіў тэр. Каліноўскаму 2-хмесячны тэрмін дзеля аўладаньня белмовай і вывучэньня граматыкі і правапісу. Тав. Каліноўскі павінен 2-га лістапада г. г. зьявіцца ў акруговы інспэктарыят Нар. Асьветы, дзе будзе праверана выкананьне гэтае ўмовы. У залежнасьці ад вынікаў будзе вырашана пытаньне аб далейшай працы тав. Каліноўскага.

Пам. пракурора РОЗЕНГАУЗ.

На заметку «ВУЧЭБНУЮ НАГРУЗКУ ТРЭБА ЎПАРАДКАВАЦЬ» („Сав. Беларусь" № 221) Рагачэўскі райінспэктарыят дае наступнае тлумачэньне:

1. Настаўніх Бароўчанка другі год вядзе 4-ю групу ў школе № 4 і мае дадатковa працу ў вячэрняй школе.

2. Настаўніца Брылёва ў мінулым годзе вяла групу ў школе № 4, а ў гэтым годзе мае нагрузку толькі на 42 руб.

3. Настаўніца Біруковіч у мінулым годзе вяла таксама групу, якую вядзе і ў гэтым годзе.

4. Брылёва і Біруковіч акрамч вызначанай працы дадатковых нагрузак ня мелі і ня маюць.

ГУРТКАВАЯ ПРАЦА ВЯСКОВАГА НАСТАЎНІЦТВА.

Навукова-мэтадалёгічны камітэт Наркамасьветы вызначыў для распрацоўкі вясковых настаўніцкіх гурткоў поўныя тэмы як выхаваўчага, так і мэтадычнага характару. На працягу вучэбнага году будзе распрацавана 11 пытаньняў, сярод якіх антырэлігійнае выхаваньне, самакіраваньне, грамадзка-карысная праца, піянэр-рух і дашкольная і дашкольная праца. Па кожнаму пытаньню ўжо выначаны і зацьверджаны кваліфікаваныя педагогі. Па Менску ўжо праведзен запіс настаўніцтва ў тыя ці іншыя сэкцыі. Кожная школа павінна будзе ўзяць адно, найбольш два пытаньні.

ДАСЬЛЕДЧАЯ ПРАЦА.

Мэтадычным Наркамасьветы даў на месцы ўказаньні аб пераходзе гарадзкіх вытворчых гурткоў на сэкцыйны від працы. У цэнтры ўвагі ставяцца пытаньні выхаваўчага характару. Праца сэкцый будзе насіць дасьледны напрамак. Асноўнай лябараторыяй будзе школа. Менску даручана распрацаваць пытаньні антырэлігійнага выхаваньня, палавога выхаваньня, самакіраваньне, грамадзка-карысная праца, піянэр-рух і дашкольная і дашкольная праца. Па кожнаму пытаньню ўжо выначаны і зацьверджаны кваліфікаваныя педагогі. Па Менску ўжо праведзен запіс настаўніцтва ў тыя ці іншыя сэкцыі. Кожная школа павінна будзе ўзяць адно, найбольш два пытаньні.

У ЦП ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Райёны настаўнік-упаўнаважаны ЦП саюзу.

Прэзыдыум ЦП паставіў прасіць ЦК саюзу аб утварэньні па прыкладу Заходніх чыг. упаўнаважанага ад ЦП на чыгунку МБВ. На пасаду ўпаўнаважанага рэкамандураваны т. Пармон—адказны сэкратар мясцкому і настаўнік Вузьдзенскага райёну.

Справаздачная кампанія ЦП саюзу.

У сучасны момант на Менскіх гарадзкіх сходах асьветнікаў Цэнтральнае праўленьне саюзу робіць справаздачы аб сваёй працы. Усяго будзе праведзена па гораду 6 сходаў. Апошні сход адбудзецца 14 кастрычніка.

Наша перапіска.

Я. БЛАХІНУ. Студзянецкі сельсавет, Магілёўшчына. Ваша тлумачэньне наконт заметкі „Зьвішчае школьны вучастак" можна надрукаваць толькі ў тым выпадку, калі яго падцьвердзіць райвыканком.

НАСТАЎНІЦЫ З. МАЦКЕВІЧ. Полаччына. Пастанова ЦВК і СКН РСФСР аб выплаце настаўнікам пэнсіі ў 30 руб. за выслугу гадоў яшчэ і ў РСФСР у жыцьцё не праведзена, покуль ня будзе зацьверджана Урадам СССР. Пасьля-ж зацьверджаньня Саюзным урадам, гэта настанова непаўне ўвойдзе сваё ажыцьцяўленьне і ў іншых саюзных рэспубліках, у тым ліку і ў БССР.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Аб дзейнасьці Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

На ранішнім пасяджэньні СНК быў заслухан даклад Рэктара БДУ прафэсара Пічэты аб дзейнасьці Унівэрсытэту. Дакладчык адзначыў, што за 2 гады пасьля таго, як праўленьне Унівэрсытэту рабіла справаздачу ў Савеце Народных Камісараў, Унівэрсытэт значна ўзмацніўся. За час свайго існаваньня Унівэрсытэт падрыхтаваў і выпусьціў: 550 дактароў, 850 пэдагогаў, 130 юрыстаў, і 203 эканамісты.

Навуковая падрыхтоўка окончыўшых Унівэрсытэт, па водзывах адпаведных установ, добрая. Асабліва добра падрыхтаванымі зьяўляюцца скончыўшыя медыцынскі факультэт.

Усяго студэнтаў з прыёмам гэтага году налічваецца—2562, з іх: рабочых—490, сялян—1033, служачых—943 і іншых—96. Па нацыянальнасьці склад студэнтва наступны: беларусаў—1452, яўрэяў—886, беларусаў—115, палякаў—59 і інш.—50. У гэтым годзе ў Унівэрсытэт прынята 476 чал., з іх—95 на Мэдфак, 152 на факультэт Права і Гаспадаркі, у тым ліку 59 на праўнае адзяленьне і 93—на эканамічнае, 122 студэнты прыняты на першы курс Пэдфаку і 107—на другі курс Пэдфаку. Па сацыяльнаму складу прыём у гэтым годзе палкам адпавядае тым заданьням НК Асьветы аб пралетарызацыі БДУ, якія былі даданы перад пачаткам прыёму ва Унівэрсытэт. З усяго ліку прынятых: рабочых—144, сялян—191, служачых—102, а рэшта іншыя. Членаў КП(б)Б—135, членаў ЛКСМБ—136 і беспартыйных—205. Стыпэндыямі ў гэтым годзе задаволена ўсяго 1000 студэнтаў, або 38,8 проц. Інтэрнатамі задаволена—512 чал., што, базумоўна, зьяўляецца невыстарчальным.

Навуковае абсталяваньне Унівэрсытэту досыць добрае, за выключэньнем Фізычнага Інстытуту, які пакуль што абсталяваны толькі на 17 проц.

Самым вострым пытаньнем у рабоце Унівэрсытэту - зьяўляецца беларусізацыя яго. У гэтай галіне ёсьць шмат дасягненьняў, але ёсьць яшчэ і шмат недахопаў. З боку некаторай часткі навуковых працаўнікоў, а таксама і студэнцтва дагэтуль наглядаюцца фармальныя адносіны да беларусізацыі. Студэнты добра вывучаюць і ведаюць беларускую граматыку, але гавораць паміж сабою ў большасьці парасейску. Таксама назіраецца, што на пасяджэньнях Праўленьня, дэканатаў, прадметных камісій у большасьці ўжываецца расейская мова. Асабліва дрэнна з беларусізацыяй Мэдфаку і факультэту Права і Гаспадаркі. Лепш за ўсё праводзіцца беларусізацыя на Пэдфаку. Марудны тэмп правядзеньня беларусізацыі тлумачыцца, галоўным чынам, абмежаванасьцю ліку навуковых працаўнікоў, якія-б маглі выкладаць на беларускай мове, баязьлівасьць некаторых навуковых працаўнікоў перайсьці да выкладаньня на беларускую мову, а з боку некаторай часткі навуковых працаўнікоў і фармальныя адносіны да вывучэньня беларускай мовы. Праўленьнем Унівэрсытэту для зьнішчэньня такіх зьяўвішч увесь час прымаюцца сур'ёзныя меры. Прынята пастанова, што ўсе асыстэнты і дацэнты павінны праводзіць выкладаньне на беларускай мове, а таксама прымаць залікі ад студэнтаў. Дацэнты прызначаюцца цэлай шэрагі, калі яны ведаюць беларускую мову. За невыкананьне пастановы аб беларусізацыі зьнят з пасады адзін ардзінатар. 37-мі студэнтам, якія скончылі Мэдфак і ня вытрымалі беларускай мовы, ня выдадзены дыпломы аб скончэньні Унівэрсытэту. Але таксама трэба адзначыць, што за апошнія гады ў справе правядзеньня беларусізацыі БДУ ёсьць таксама шэраг дасягненьняў. Калі ў 1926-27 г. на Мэдфаку налічвалася 1 дацэнт, 6 асыстэнтаў і 8 ардзінатараў, якія ўладалі беларускай мовай, то ў 1927-28 г. ужо налічваецца ўладаючых беларускай мовай: 1 прафэсар, 2 дацэнты, 35 асыстэнтаў, 20 ардзінатараў і інш. На факультэце Права і Гаспадаркі ў 1926-27 г. ўлададалі беларускай мовай 1 прафэсар, 2 дацэнты, 1 асыстэнт, а ў 1927-28 г.—2 прафэсары, 6 дацэнтаў і 6 асыстэнтаў. Колькасьць гадзін выкладаньня на беларускай мове таксама з кожным годам павялічваецца. Прыймаюцца меры аб прыцягненьні выкладчыкаў, якія ўладаюць беларускай мовай. Асаблівая ўвага зьвяртаецца на асьпірантаў. За апошнія 3 гады пакінута пры Унівэрсытэце ў якасьці асьпіраўнтаў 35 чал., з іх 21 беларус.

Высунута з асьпірантаў у асыстэнты—5 чал.—усе беларусы, з асыстэнтаў у дацэнты—8 чал., з іх 3 беларусы, з дацэнтаў у прафэсары—7 чал. з іх 5 беларусоў. Пры пераводзе на вышэйшыя пасады даецца перавага тым навуковым працаўнікам, якія ведаюць беларускую мову. Дакладчыкам было адзначана, як ненармальнае зьявішча тое, што некаторыя навуковыя працаўнікі, набыўшы ў БДУ годнасьць дацэнта ці прафэсара, пераяжджаюць у другое месца, адмаўляючыся ад працы ва Унівэрсытэце. З гэтым Праўленьне БДУ вядзе рашучую барацьбу.

Унівэрсытэт праводзіць таксама і грамадзкую працу. Навуковымі працаўнікамі БДУ чытаюцца лекцыі ў рабочых унівэрсытэтах і інш. Добра праводзіцца і разьвіваецца ваенізацыя Унівэрсытэту.

Выступаўшыя ў спрэчках гаварылі, галоўным чынам, аб дасягненьнях і недахопах у справе беларусізацыі Унівэрсытэту, а таксама аб падрыхтоўцы асьпірантаў з мясцовых сіл. Большасьць з выступаўшых зазначалі, што вылучэньне навуковых працаўнікоў трэба пачынаць не пасьля скончэньня студэнтам Унівэрсытэту, а яшчэ тады, калі студэнт знаходзіцца на 3-м курсе і, базумоўна, калі студэнт да гэтага здольны. Яшчэ і надалей, як зазначыў т. Галадзед, Праўленьню БДУ прыдзецца запрашаць асабліва выдатных прафэсароў, якія ня ведаюць беларускай мовы, але ў гэтым, гаворыць т. Галадзед, нічога страшнага няма, толькі трэба каб і гэтыя прафэсары вывучалі бел. мову, каб больш пасьпешна праводзіць выкладаньне. Перад праўленьнем Унівэрсытэту стаіць задача ўмець скарыстаць навуковых працаўнікоў. Выступаўшыя таксама зазначалі на неабходнасьць арганізацыі Хіміка-Тэхнічнага Факультэту.

Для апрацоўкі рэзалюцыі па дакладу рэктара БДУ, Саветам Народных Камісараў утворана камісія, якая павінна падаць праэкт пастановы на наступным пасяджэньні СНК.

Аб выстаўцы сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Згодна пастановам СНК аб арганізацыі ў 1930 г. у Менску выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, НК Земляробства і ВСНГ быў пададзен на зацьверджаньне СНК праэкт кашторысу на арганізацыю гэтай выстаўкі. Для гэтай выстаўкі маркуецца пабудаваць шэраг спэцыяльных выставачных будынкаў, пры гэтым 2 будынкі будуць пабудаваны капітальнымі з тым, каб іх можна было скарыстоўваць увесь час. Выстаўку маркуецца пабудаваць на тэрыторыі гаспадаркі Вялікая Сьлепня. Гэтая выстаўка мае на мэце дэманстраваць дасягненьні і пэрспэктывы гаспадарчага будаўніцтва БССР. Будуць пабудаваны павільёны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Будзе павільён аграманжанага сэктару сельскай гаспадаркі, павільён мэханізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, павільён расьлінагадоўлі. Будуць заложаны на тэрыторыі выстаўкі севазвароты, разгорне працу бульбяная станцыя і станцыя па расьлінаводству, а таксама па сьвінагадоўлі, птушніцтву і наогул па жывёлагадоўлі. Будзе дэманстравацца правядзеньне мэліярацыі, вынікі яе і гаспадарчы эфэкт. Маркуецца пабудаваць узорную сялянскую сядзібу драўнянага тыпу, агнятрывалага, пабудоўка каналізацыі, водаправоду і супроцьпажарнае абсталяваньне і шэраг іншых павільёнаў, Дасёўсіх павільёнаў маркуецца пабудаваць чыгуначную ветку, каб даць магчымасьць лягчэй пераводзіць экскурсантаў і экспанаты.

СНК згадзіўся з такім праэктам і выначыў кошт гэтай выстаўкі ў разьмеры 600000 руб.

СНК аб дзейнасьці Навукова-Дасьледчага Інстытуту.

На гэтым пасяджэньні СНК была прынята рэзалюцыя па дакладу Дырэктара Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна т. Гарэцкага.

У гэтай рэзалюцыі СНК адзначае, што за кароткі час дзейнасьці (паўтара гады) Навукова-Дасьледчым Інстытутам зроблена значная праца, як у галіне арганізацыйнай, так і ў галіне навукова-дасьледчай. У далейшай працы СНК даручыў Навукова-Дасьледчаму Інстытуту яшчэ больш інтэнсыўна весьці падрыхтоўку маладых беларускіх дасьледчыкаў, шырэй разгарнуць дзейнасьць Інстытуту па ўвязцы дасьледчай справы з сялянствам і з вытворчасьцю, пашырыць працу Інстытуту сялян-дасьледчыкаў, шырока паставіць вывучэньне садыяністычных форм сельскай гаспадаркі, праблемы калектывізацыі каапэраваньня, узмацніць дасьледчую працу па сельска-гаспадарчай і лясной тэхналёгіі, асабліва па тэхналёгіі, бульбы, разгарнуць працу аддзелу расьлінагадоўлі і прыкладной батанікі, вывучыць эфэктыўнасьць укладаньняў у сельскую гаспадарку, а таксама вывучыць ураджайнасьць, асабліва ўраджайнасьць ільну і г. д.

Для разгарненьня працы Навукова-Дасьледчага Інстытуту, СНК прызнаў патрэбным пашырыць яго матар'яльную базу і даручыў НК Земляробства, НДІ і Гарадзкому Савету вырашыць пытаньне аб адводзе Інстытуту поўных вучасткаў лесу і зямлі з савецкай гаспадаркі Вялікая Сьлепня. СНК таксама прызнаў патрэбным пабудаваць на працягу 2-х год дасьледчую хімікатэхналёгічную лябараторыю НДІ. Дзяржпляну запрапанавана разгледзець 5-цігадовы пэрспэктыўны плян разгортваньня працы і будаўніцтва Інстытуту, а ўсім акрыканкомам і зямельным аддзелам— распрацаваць практычныя мерапрыемствы для ўзмацненьня працы з сялянамі -дасьледчыкамі і для ўцягненьня ў гэтую працу шырокіх колаў бяднацкага і сярэднацкага сялянства.

МЕСЯЧНІК „ЗА ГРАМАТУ" НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

ГОМЕЛЬ РАСПАЧАЎ МЕСЯЧНІК НЕ З 15-га ВЕРАСЬНЯ, А З 1-га КАСТРЫЧНІКА—«МЕСЯЧНІК—РЭЧ НЕПАТРЭБНАЯ».—НА РАЙЁНАХ ПРА МЕСЯЧНІК ВЕДАЮЦЬ ТОЛЬКІ КІРУЮЧЫЯ АСОБЫ,—РАЙЁНЫ НЯ МАЮЦЬ ПЭРСПЭКЦЫЙНЫХ ПЛЯНАЎ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ.—Т-ВА «ПРЭЧ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ», ЯК АФОРМЛЕНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ГОМЕЛЬШЧЫНА НЯ МАЕ.

Ня гледзячы на дадзеныя паказаньні аб правядзеньні месячніка «За грамату» па Беларусі з 15-га верасьня г.г., Гомель распачаў правядзеньне яго з 1-га кастрычніка г. г. праз падрунаваньне плану гэтай кампаніі ў газ. «Палеская Праўда» і дадатку «За грамату» ад 30-га верасьня г. г. Ці дайшоў гэты плян у райёны,—казаць аб гэтым цяжка.

Пару тыдняў таму назад па лініі АК КП(б)Б дадзена паказаньне ўсім райкомам КП(б)Б аб іх удзеле ў правядзеньні месячніка, пачатку навучальнага году ў лікпунктах і працы т-ва „Прэч Няпісьменнасьць".

Прыцягнута да ўдзелу ў справе зьнішчэньня няпісьменнасьці каапэрацыя, якая ставіць сваёй мэтай зьнішчаць няпісьменнасьць сярод каапэраванага насельніцтва.

У працаўнікоў акрінспэктарыяту масцца ўпэўненасьць, што хоць з месячнікам і спазьніліся, але-ж плян свой яны выканаюць цалкам, і што значна ім дапаможа праводзімы зараз месячнік „За грамату". Зусім іншую думку выказаў адзін кіруючы акруговы працаўнік, які адзначыў, што **«трэба пераходзіць да практычнай працы—месячнік рэч непатрэбная»**, зусім запамятаваўшы аб тым, што без удзелу грамадзкасьці, без дапамогі з боку актыву праводзіць працу нам будзе цяжка.

Аб правядзеньні месячніка па райёнах ведаюць толькі кіруючыя асобы; шырокія колы насельніцтва аб гэтым калі і ведаюць што, дык толькі з газэт, пераважна цэнтральных, бо «Палеская Праўда» гэтым пытаньнем не зайналася.

Адзін з райённых працаўнікоў адзначыў, што месячнік застаўся зусім у баку, райёны праводзілі так многа розных кампаній больш каштоўных, чым месячнік,—і гэта не ў адным райёне, а гэтакае зьявішча па ўсёй Гомельшчыне.

Усе дырэктывы па правядзеньню месячніка і пачатку навучальнага году да сёньняшняга дню належнага ўплыву і руху ў гэтай справе на мясцох не зрабілі.

Па Буда-Кашалёўскаму і Ўваравіцкаму райёнах да гэтага часу ня вызначана сетка лікпунктаў, няма пэрспэктыўнага пляну ліквідацыі няпісьменнасьці, інспэктары ня ведаюць —колькі няпісьменных ім трэба абхапіць лікпунктам.

Пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці адпаведныя кіруючыя арганізацыі Б.-Кашалёўскага і Ўваравіцкага райёнаў займаліся з прахладцам, а адзін з кіруючых працаўнікоў гэтых райёнаў у заключэньні зазначыў: **„магчыма што-небудзь і зробім, але-ж абяцаць цяжка, бо ёсьць шмат іншай працы, больш патрэбнай".**

Па Хойніцкаму і Брагінскаму райёнах пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці і правядзеньню месячніка підзе не абгаварвалася. Такі буйны цэнтр, **як Рэчыца**, да месячніку аднесься зусім бязуважліва. Пляну правядзеньня месячніка Рэчыца таксама ня мае, хоць там і ёсьць асобны інспэктар, кіруючы палітасьветпрацай.

Грамадзкая думка навокал пытаньня зьнішчэньня няпісьменнасьці зусім не закранута, падбор працаўнікоў, скарыстаньне актыву камсамолу, які выдзяляе сваіх ліквідатараў, да гэтага часу па райёнах ня вырашана. Гэта пытаньне патрабуе тэрміновага вырашэньня адпаведных органаў.

Т-ва «Прэч Няпісьменнасьць», як афармленай арганізацыі—няма, хоць і ёсьць часовы акруговы савет, які склікаў адно пасяджэньне, дзе разглядаліся пытаньні аб афармленьні арганізацыі, утварэньні акруговага кіруючага цэнтру, пашырэньне сеткі ячэек і ўтварэньне іншых кіруючых цэнтраў. Пратакол разасланы на райёнах бяз усякіх паказаньняў, і на гэтым праца часовага акрсавету спынілася.

Настаўніцтва, якое ўжо праводзіла гэту працу раней, да справы зьнішчэньня няпісьменнасьці прыцягваецца, але-ж і сярод іх грамадзкая думка навокал гэтага пытаньня ня складзена. Калі ў Ўваравіцкім райёне на канфэрэнцыі стаяла пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці, дык у рэзалюцыі адзначана па гэтаму дакладу, што пры індывідуальным навучаньні плата па 3 руб. надзвычайна малая і яе трэба павялічыць.

Страхавыя плацяжы павінны паступіць у тэрмін

Да 1-га кастрычніка страхавыя агенцтвы Белдзяржстраху павінны былі перадаць сялянству страхавыя акладныя лісты і з гэтага часу ўжо павінен распачацца збор плацяжоў.

Сёлета збор страхавых акладных плацяжоў будзе рабіцца райвыканкомамі і сельсаветамі, на якіх урад усклаў адказнасьць за пасьпяховы збор гэтых плацяжоў.

Водпуг папярэдніх меркаваньняў праўленьня Белдзяржстраху, па БССР будзе налічана каля 5.000.000 руб. акладных страхавых плацяжоў. Аплата апошніх сёлета павінна быць зроблена ў два тэрміны, якімі вызначаны другі і трэці тэрмін аплаты сельска-гаспадарчага падатку. Гэтыя тэрміны па розных райёнах і сельсаветах вызначаны пастановамі акруговых выканаўчых камітэтаў.

Для вызваленьня бяднейшага сялянства ад аплаты акладных страхавых плацяжоў адпушчан для ўсіх округ БССР ільготны фонд у разьмеры 676.487 руб. Гэтая сума дае магчымасьць вызваліць ад аплаты страхавых плацяжоў сялянскую беднату, забясьпечыць льготамі сем'і чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан. Пры ўручэньні акладных страхавых лістоў аб прадастаўленьні льгот зроблены адпаведныя адзнакі, і кожны селянін ведае—ёсьць яму льгота, ці не.

Райвыканкомам і сельсаветам неабходна прыняць усе меры да таго, каб забясьпечыць своечасовы збор страхавых плацяжоў к вызначаным тэрмінам. Працу па збору плацяжоў трэба арганізаваць так, каб сялянства бяз усялякай валакіты і цяганіны змагло аплаціць належачыя з іх аклады. Трэба растлумачыць сялянству, што ў выпадку навыплаты ў тэрмін страхавых плацяжоў, апошнія будуць спаганяцца ў прымусовым парадку і, апрача таго, будзе налічвацца пеня, што, безумоўна, не ў інтарэсах плацельшчыкаў.

Сялянства павінна быць зацікаўлена ў тым, каб своечасова ўнесьці свае страхавыя плацяжы і тым самым забясьпечыць сабе поўную магчымасьць вольна распараджацца сваімі даходамі.

Райвыканкомы і сельсаветы павінны памятаць, што асеньні перыяд зьяўляецца найбольш спрыяючым у сэнсе збору ўсялякіх у тым ліку і страхавых плацяжоў, бо ў гэты час сялянства рэалізуе прадукты ўраджаю і, наогул, сельскай гаспадаркі.

Своечасовы збор акладных страхавых плацяжоў патрэбен Дзяржаўнаму страхаваньню для своечасовай выплаты сялянству па страхавых стратах, а адгэтуль вынікае, што само сялянства павінна быць моцна зацікаўлена ў своечасовай аплаце сваіх акладных страхавых плацяжоў.

Райвыканкомы і сельсаветы разам са зборам страхавых плацяжоў павінны ўзмацніць прымусовае спагнаньне страхавой недоімкі за мінулы гаспадарчы год.

В. З.

ШЫРОКАЯ КРЫТЫКА НЕДАХОПАУ

(Усебеларускі зьезд будаўнікоў).

Рабочыя-будаўнікі добра зразумелі выкінуты лёзунг крытыкі і самакрытыкі. Аб гэтым лепш за ўсё сьведчылі выступленьні дэлегатаў зьезду па дакладу свайго цэнтральнага праўленьня.

Кожны з прамоўцаў пасьпяшаў на трыбуну, каб скарыстаць кожную хвіліну, дадзеную яму рэгляментам.

— Аб дасягненьнях будзем мала гаварыць—яны нам усім вядомы. Мы лепш пагаворым аб недахопах і як іх у далейшым зьліквідаваць,—агульнае жаданьне ўсяго зьезду.

Аб якіх-жа недахопах гаварыў 8-мы ўсебеларускі зьезд будаўнікоў?

— Культурная рэвалюцыя вымагае пашырэньня сярод рабочых культасьветнай працы. Трэба весьці антырэлігійную прапаганду і барацьбу в п'янствам, а ў нас, на мясцох, няма дзе прытуліцца, бо ня маем належных клюбаў.

Там, дзе яны ёсьць, праца вядзецца так, што дарослых рабочых яна мала цікавіць, і таму мімаволі прыходзіцца ісьці ў „пивнушку",—вось вам і перамагайце ў такіх умовах, п'янства—кажуць дэлегаты зьезду.

Рабочы-будаўнік усю зіму чакае з непярплівасьцю пачатку будаўнічага сэзону. Надышла вясна, рабочы хоча працаваць, а гаспадарнікі яшчэ ненадрыхтаваны,—у іх усё яшчэ праэктаў няма, няма матар'ялаў. Што рабіла ў гэты час ЦП саюзу?—пытаюцца дэлегаты.

Кажуць, што якасьць будаўніцтва не на належнай вышыні. Віваваяць у гэтым рабочага. Калі будаўніцтва пачынаецца ў канцы мая, а то і чэрвеня, дык, зразумела, рабочаму не да якасьці: ён хоча больш зарабіць, каб пражыць з сям'ёй зіму. Калі-б у нас будаўнічы сэзон распачынаўся своечасова, дык рабочаму ня трэба было-б спяшацца, якасьць працы была-б лепшая.

Рабочы і так клапоціцца аб якасьці, але рэжуць сырыя бярвеньні на дошкі і з іх будуюць, а праз 3-4 месяцы ўсё папсавалася. Вінаваты гаспадарнікі, што не падумалі своечасова зрабіць запас матар'ялу.

— Наадварот, рабочыя прымаюць меры для зьліквідаваньня недахопаў: яны гавораць аб іх гаспадарнікам, але за гэта рабочых называюць бузацёрамі,—скардзіцца адзін з дэлегатаў.

— ЦП саюзу мала дбае аб жывой сувязі з акруговымі арганізацыямі саюзу: за паўтара гады мы бачылі прадстаўніка ЦП толькі раз і то ён праляцеў, як мэтэор,—зазначае дэлегат з Гомельшчыны.

Скардзіліся дэлегаты і на тое, што заўсёды ідзе валакіта з калдагаворамі—іх дасылаюць на месца вельмі позна і няма часу іх, як належыць, абгаварыць. Замест мая—калдагавор зацьвярджаецца ў лістопе...

— А пра інж.-тэхнічных працаўнікоў ЦП дык вусім забыла. Аб іх нічога няма ў калдагаворы, і ЦП амаль што ня цікавіцца працай сэкцыі інж.-тэхнічных працаўнікоў,—заяўляе адзін з прамоўцаў.

— Трэба падняцьць зарплату адстаючых груп рабочых; трэба калдагаворы своечасова дасылаць на абгаварыньне рабочых; больш жывой сувязі; больш прыслухоўвацца да голасу рабочых. Трэба сур'ёзьней падумаць аб падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы; разгарнуць клюбнае будаўніцтва. Разгарнуць актырэлігійную прапаганду і барацьбу в п'янствам. Больш увагі беларусізацыі; наладзіць вытворчую асьвету.

Гэтага патрабуюць будаўнікі—удзельнікі зьезду.

ХРОНІКА.

НА ЎСЕСАЮЗНУЮ НАРАДУ ПА ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ.

Учора ваяжэрніі цягнікам выехалі ў Масову на Усесаюзную Нараду па перавыбарах саветаў т. т. Хацкевіч, Рабінавіч (Шенгарсавет) Прусакова (старшыня Гомельскага гарсавету) Файнбург (Заг. Арг. Аддзелу ЦВК), Зяньневіч (старшыня сельсавету Полацкай акругі) Вінаградаў (старшыня РВК) і тав. Мазурэнка (старшыня сельсавету Бабруйскай акругі).

Вечар удзельнікаў лёдаколу „Малыгін".

У нашай газэце паведамлялася аб тым, што ў Менску мае адбыцца вечар удзельнікаў лёдавага паходу савецкага лёдаколу «Малыгін». Па атрыманых вестках гэты вечар адбудзецца 22-га кастрычніка ў Доме Культуры.

Мануфактура для лёнаводных раёнаў.

Па паведамленьню Нар. Кам. Гандлю для БССР выдзелена 8 вагонаў базаўняных тканін для ўзмацненьня забясьпечаньня лёнаводных раёнаў. Нар. Кам. Гандлю БССР разьмеркаваў гэту мануфактуру (паміж Віцебскім спажывецкім саюзам і яго Полацкім аддзяленьнем, Днепрасаюзам і Магілеўскім яго аддзяленьнем і Гомельскім акрсаюзам.

Адчыненьне одонтолёгічнага інстытуту.

У Менску адчыніўся одонтолёгічны інстытут Нар. Кам. Аховы Здароўя. У сувязі з гэтым значна пашыраецца кваліфікаваная зубаўрачэбная дапамога ў Менску. У інстытуце маецца спэцыяльны рэнтгенаўскі габінэт для здымкаў зьвязаных з зубнымі хваробамі.

Ад 10 да 2 гадзін дня будзе праводзіцца дарэмны прыём усяго насельніцтва, а з 4 да 8 гадзін увечары прыём застрахаваных.

Папаўненьне музэю рэвалюцыі БССР.

За апошні час музэй рэвалюцыі БССР папоўніўся новымі карцінкамі.

Так, нядаўна атрыманы ў аддзел гісторыі Кастрычнікавай рэвалюцыі карціны малодога мастака С. М. Кантара.

Тэма адной карціны «Свабодная Беларусь». Тэма другой карціны—адзінства рабочых і сялян.

Беларускія кіно-фільмы—за межы.

Па атрыманых вестках, экспартыраваная Управай Дзяржгандлю БССР кіно-фільма «У вялікім горадзе», вытворчасьці Белдзяржкіно, рэалізавана ў Латвіі і Літве.

Управай Дзяржгандлю БССР прымаюцца мерапрыёмствы да рэалізацыі іншых карцін, вытворчасьці Белдзяржкіно.

Макуха для БССР.

Згодна паведамленьню Нар. Кам. Гандлю СССР, канчаткова ўстаноўлен плянавы завоз макухі для БССР на 1928-29 гаспадарчы год. Усяго на гэтаму пляну мае быць завезена 500000 пуд. макухі.

Макуха будзе атрымоўвацца па лініі «Масложырсындыкату» і «Саюзхлебу».

АДЧЫНЕНЬНЕ ДЫЗТЫЧНАЙ СТАЛОЎКІ.

Менская інспэкцыя Аховы Здароўя заказала мэханічнае абсталяваньне для Менскай дыэтычнай сталоўкі.

Усе працэсы работы ў гэтай сталоўцы будуць мэханізаваны. Сталоўка адчыніцца ў лістападзе месяцы.

Марынаваныя грыбы ў Італію.

На Белдзяржгандаль ускладзена заданьне па экспарту марынаваных грыбоў у Італію ў колькасьці 2500 пудоў. Першая партыя адсылаецца ў бягучым месяцы.

Усебеларускі зьезд калгасаў.

Усебеларускі зьезд калгасаў адчыніцца 10 кастрычніка. У працы зьезду прыме ўдзел 165 дэлегатаў ад калектыўных гаспадарак БССР і 16 прадстаўнікоў ад машынных і мэліярацыйных таварыстваў ад усіх округ. Дэлегаты зьезду будуць размешчаны ў адным з гасьцініц. Праца зьезду прыпяцнецца 2-3 дні. Пасяджэньні зьезду мяркуецца праводзіць у памяшканьні клюбу Карла Маркса.

У „ЧЫРВОНЫМ КРЫЖЫ".

○ 120 гурткоў Першай Дапамогі т-ва Чырвонага Крыжу зараз налічваецца па Менску в лікам сяброў у 35.000 чал. Па райёнах акругі гэткіх гурткоў маецца 55 з лікам сяброў у 2000 чал.

○ Пленум ЦК Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжу пераносіцца на 25-га кастрычніка, згодна пастановы прэзыдыуму ЦК.

○ Абсьледаваць дзейнасьць Заслаўскага і Лагойскага райённых камітэтаў т-ва Чырвонага Крыжу пастанавіў Менскі акруговы камітэт Чырвонага Крыжу. Мэта абсьледаваньня—выявіць маючыяся недахопы і ажывіць працу т-ваў.

○ Перасоваччы зубны габінэт Менскага т-ва Чырвонага Крыжу пастаноўлена накіраваць у Бягомльскі райён для абслугоўваньня вясковага насельніцтва, тэрмінам на 3-4 месяцы.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 9-X-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—77, куп. 4—75.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—13,5, куп. 5—11,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—2,5 куп. 5—00,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,49, куп. 25—39.

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122, куп. 120.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 104—32 куп. 104—27.

Абл. 6 пром. паз. індустр. прад. 24—87,5, куп. 24—77,5.

Менскі дзень.

524.691 руб. адпушчана ў бягучым бюджэтным годзе на рамонт і абсталяваньне агульных памяшканьняў і сталовых у ВНУ Беларусі.

15500 руб. прадугледжана ў бюджэце Нарнамасьветы на субсыды беларускім студэнцкім земляцтвам.

Спэцыяльны будынак для дзіцячай кансультацыі пастанавіў пабудаваць Менскі гарсавет. Складаньне праэкту і кашторысу даручана акруговай інспэкцыі аховы здароўя.

1059 тон хлебапрадуктаў загатовіла ў верасьні месяцы непасрэдна ад сялянства спажывецкая кааперацыя БССР. Заданьне-ж было—1061 тона.

5 вагонаў цыбулі ўжо экспар таваў заграніцу Белдзяржгандлю. Плян загатоўкі цыбулі мяркуецца выканаць поўнасьцю.

Кантрактацыя плода-гародніны.

Белдзяржгандзем выпрацаван праэкт кантрактацыі плода-гародніны на 1928-29 г.

Пакуль намечаны да кантрактацыі: цыбуля, агуркі і яблыкі. Цыбуля ў колькасьці 2000 тон, агуркоў 3000 бочак і яблык—3000 тон. Для ўдзелу ў кантрактацыі прыпяцчы абедзьве сыстэмы кааперацыі.

Фізкультура і спорт.

Футбольны матч будаўнікоў.

У нядзелю 7 кастрычніка на пляцоўцы „Прафінтэрн" адбыўся футбольны матч паміж камандамі менскіх будаўнікоў і будаўнікоў Гомелю.

Матч скончыўся на карысьць каманды Менску з вынікам 5:4. Нажаль, абедзьве каманды паказалі вельмі нецікавую і грубую гульню. Судзіў тав. Леў.

Баскетбольны матч Менск—Гомель.

Таксама ў нядзелю 7 кастрычніка адбыўся матч на баскетболу паміж камандамі саюзу будаўнікоў Менску і Гомелю. Выіграла менская каманда з вынікам 36:12.

Матчы сабралі шмат гледачоў. Зьезд будаўнікоў палкам з аркест, ам музыкі прыйшоў на матч сваіх фізкультурнікаў.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Угрунь" Выданьне другое. Андрэй Александровіч. Стар. 125, цана 75 кап.

2. «Збор твораў» том 5. Янка Купала. Стар. 273, цана 2 руб. 75 кап.

3. «Революцыя и культура» № 18, стар. 80, цана 50 кап. Выданьне газэты «Правда»—Масква.

Дакуль так будзе?

(Да ўвагі Белдзяржвыдавецтва).

З часу пераходу 1-й дзярждрукарні ў новае памяшканьне (б. памяшк. ЦСПСВ), для карэктуры быў адведзен пакой, у якім згрудзілі карэктуру на ўсіх нацмовах.

Працуе ў гэтым памяшканьні да 25 чал. з агульнакарэктарскага аддзяленьня, а ў дадатак да іх (мусіць, з мэтай уплатаненьня плошчы) перанялі газэтную карэктуру трох газэт, што, узогуле, складае кали 35 чалавек.

Праца карэктара патрабуе галоснай чыткі. У такой зараз гамонянь 15-17 чал. на розных мовах, якія з прычыны малога памяшканьня, імкнуцца перакрычаць адзін аднаго, каб даць магчымасьць свайму падчытчыку пачуць.

Рэзананс у памяшканьні вялікі. Ад чыткі страшэнны гоман. У карэктара ад напружаньня вочы на лоб лезуць, і часта ад вялікага гоману падчытчык ня толькі ня можа сачыць за арыгіналам, а сь выдзіўленьнем паглядае ў вочы карэктару, як той кратае губамі, выказваючы нейкія гукі. Пры такой працы ня толькі нельга сачыць за выместам сказу, але не запамятаеш таго, што хвіліну назад сам казаў.

Якая карысьць ад такой працы Белдзяржвыдавецтву—невядома, але трэба сказаць, што газэтная карэктура тут церпіць шмат.

Чытаючы газэту, патрабуецца поўны спакой, бо чытаць па пекальні разоў, як гэта робіцца ў брашурах (чытаюць на 3-4 разы) газэтным карэктарам немагчыма з-за адсутнасьці часу, а адразу пасьля першай карэктуры газэта выраставецца, прычым выходзіць з пропускамі і скажэньнямі.

Рэдакцыі газэт, якія друкуюцца ў першай друкарні, павінны паставіць перад друкарняй пытаньне рубам, каб іх карэктуру ізаляваць ад агульнай карэктуры, бо інакш нельга быць гарантаваны, што свайго сказу ў газэце аўтар не зразумее, а чытач—тым больш.

Друкар.

Суд.

Барысаўскія каапэратары і прыватнікі.

Справа барысаўскіх каапэратараў і буйных прыватных гандляроў, адмененая Вярхоўным Судом Рэспублікі па пратэсту Пракуратуры Рэспублікі, з прычыны няправільнага дастасаваньня да асуджаных амністыі і мягкасьці прысуду, разглядалася зноў Выязной Сэсіяй Менскага Акружнога Суду ў г. Барысаве ў іншым складзе судзьдзяў.

Абвінавачаныя Шышла, Бурка, Грыбоўскі і Аўрушкін ад суду ўхіліліся, справа адносна іх вылучана асобна. Паводле даных судовага сьледзтва, справа малюецца ў наступным:

З ведама старшыні праўленьня прыгараднай спажывецкай каапэрацыі Шышла і загадчыка гандлёвай часткі Асіпоўскага, па іх пісьмовых і вусных распараджэньнях загадчыкі крам: Бурко, Грыбоўскі і прыказчыкі Ліберман і Аўрушкін на працягу 2 год, маючы прыхільнасьць да прыватных гандляроў, лепшыя тавары, як мануфактуру, муку і інш. пэлымі партыямі збывалі прыватным гандлярам Пеклеру, Іоффе, Давыдсон і Файнбергу. Прыказчык Ліберман асабліва дапамагаў прыватнікам, ён пазычаў у прыватнікаў грошы в умовай зьвярнуць доўг не грашыма, а дэфіцытнымі таварамі, на які тавар прыватнікі накладалі да 100 проц. надбаўкі і потым прадавалі пайшчыкам таго-ж спажывецкага таварыства. Ліберман таксама дастаўляў мануфактуру ў прыватную кравецкую майстэрню свайго цесьця Фішкінда, які лічыўся пайшчыкам, праз чорны ход і без сяброўскай кніжкі.

Касірша Жукоўская перашкаджала Ліберману гаспадарыць у краме, спаўняць тавары пайшчыкаў—прыватнікам і за гэта яе ўбралі на іншую пасаду, а Ліберману як спэцу павялічылі пэнсію.

Калі прыватнікі прыпохалі такую бяздык проста ўносілі аванс на тавар, а потым яго разьбіралі.

Абабраўшы тавары ў спажывецкай кааперацыі, прыватнікі як гораду Барысаву так і ўсёй акругі панягнулі да крам Барысаўскага ЦРК, так таксама знайомых прыхільнікі—загадчыкі крам: Пагаржэльскі, Гінзбур і Гураты і па 6-7 разоў у месяц адпускалі прыватным гандлярам перавагу муку, крупу.

Прыпаўкі каапэрацыі пусьцелі, пайшчыкі прыходзілі купляць сёе-тое, але адказ быў такі:—пачакайце з тыдзень, тавар будзе. Пакуль пайшчыкі чакалі, прыватнікі пускалі чорны ход, як мурашкі расьцягнулі тавар.

Так прыватнікі ліквідавалі дзьве багатыя базы двух каапэратыўных аб'яднаньняў. Акрамя збыту тавараў прыватнікам, Бурко ашчэ растраціў каля 800 руб., за што Барсудом ужо асуджан на два гады выпраўленьня.

ПРЫСУД:

Аболя Ліберман на тры гады; Альфонса Пагаржэльскага на два гады; Зальман Асіпоўскага, Гершана Гінзбурга, Сёмкі Гуратыя на 1 году і 6 месяцаў, Пеклера Анатолія на 1 год 4 месяцы, Абрама Іоффе на адзін год зьвяволеньня. Усіх з строгім адмежаваньнем. Вульфа Файнберга на 400 р., Дэйвру Давідсон на 500 руб. штрафу на прыбытак дзяржавы, амністыі да асуджаных не дастасавана, таму што злачынства працягвалася і пасьля выданьня акту аб амністыі.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Справа антысэмітаў з Менскай дзіцячай клінікі другі раз будзе разглядацца ў Менскім акруговым судзе 25 кастрычніка г. с. з удзелам пракурора і абароны.

ТЭА-КІНО ХРОНІКА.

Менск абагаціцца в кастрычніка гэтага году яшчэ адным надзвычайна добрым тэатральным памяшканьнем. У новым будынку Цэатр. Дому Селяніна пабудавана добрае тэатральнае памяшканьне на 420-500 асоб. Асабліва добра пабудавана сцэна, якая мае жалезную процінажарную вастлопу, над'ёмку для дэкарацыяў (адразу з двара на бальком сцэны) і 8 пакояў—акторыяў і кінобудку. У фойэ (на абодвых паверхах, бо тэатр двохярусны) будуць размешчаны часткова экспанаты сел.-гасп. музэю, як, прыкладам, экварыумы і г. д.

Штат тэхнічных працаўнікоў. БДТ-1 папоўніўся добрымі адказнымі працаўнікамі. Прыехалі на працу—новы мэханік сцэны т. Глебаў і мастак-электраасьвятлёць тав. Цررэтэльні. Апошні з Маскоўскага Камернага тэатру.

У Гомелі для БДТ-2 пераробляецца пад тэатр былы будынак цырку; узводзіцца сталая сцэна з калясьнікамі; надзяцца з бакоў фойэ.

Магілеў у гэтым годзе таксама пераабсталяваў сцэну ў сваім тэатры, пашырыў фойэ.

— Кіно-фільм «Песьня вясны» (па апавяданьню Я. Коласа «На прасторах жыцьця») без малога палкам зазьняты в натуры. Непагодлівае надвор'е апошніх дзён не дае магчымасьці кончыць здыманьне сцэн на чыгунцы і патрэбных для мантажу казалкаў. Здымкі „ў павільёнах" на кіно-фабрыцы займуць ня больш месяца. Такім чынам фільм пасьпее да сьнежаньных часоў.

У фільме здымаецца артысты БДТ і Платонаў (рабфакавец Шулевіч).

— Кіно-экспэдыцыя фільму «Хвоі гамоняць» (Атаман Аса) вяла інтэнсыўна здымкавую працу ў Гомелі і каля яго. Асыстэнт пры рэжысэры Маўчанаве працуе ў тэатр спэварыя Анат. Вольны. З вядомых Менску артыстаў у гэтым фільме здымаюцца арт. БДТ1 В. Полла і кіно-артыстка Кудзелька. Натурная зьзьёмка, калі пашчасьціць надвор'е, магла-б быць скончана пры 7-10 дзён.

— Вытворчасьць Белдзяржкіно ў 1928-29 годзе вызначываецца ў ліку 10 мастацкіх фільмаў, 4-х культурфільмаў і 12 выпусках кінохронікі. Пасярэдні тэматычны плян зацверджаны для грамадзянскага абгавору.

— Літаратурна-мастацкі адзел Белдзяржкіно прыступіў да распрацоўкі пяцігадовага тэматычнага пляну.

— Белдзяржкіно склала ўмову з вялікім нямецкім фірмаю „Хом-фільм" аб супольным выпуску двох фільмаў; «Шатон» і Талстога (па іх выбару) і «1812 год» (Нэман і Бярэзіна)—па выбару Белдзяржкіно. Здымкі з натуры будуць рабіцца ў нас, павільённыя—на фабрыцы «Хом-фільм».

— Малады рэжысэр-аператар Маскоўскага кінаўчэбнага культур-фільму „Кагас" (калектыўная гаспадарка).

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У аўторак 9-X-28 г. а 6 гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне бюро ячэйкі КП(б)Б Працасьветы па пытаньні рэарганізацыі ячэйкі.

— У аўторак 9-га кастрычніка роўна а 8 гадзіне ўвечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

У абвестцы дню:

Даклад загадч. АПА ЦК Сянкевіча аб итогах 6 кангрэсу Камінтэрну.

ПЭДГАБІНЭТ.

У серэду 10-X-28 г. а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца канфэрэнцыя працаўнікоў пляцовак Менскай акругі.

У серэду, 10 кастрычніка, а 7 гадз. ўвечары, у памяшканьні Дому Працасьветы адбудзецца апошні дэлегацкі сход гарадзкога райёну.

Яўка абавязкова без спазьненьня. Дэлегаты, якія вучацца ў партшколе, на гэты дзень ад школы аслабаняюцца.

У серэду, 10 кастрычніка, а 6 гадз. ўвечары, у памяшканьні Гаррайкому адбудзецца нарада апоргаў Гаррайёну.

У парадку дню:

1. Плян распрацоўкі пастаноў VI кангрэсу ў ячэйковых гуртках.

2. Аб арганізацыі гурткоў і самаадукацыйнай паліт. адукацыі ў ячэйках.

У аўторак, 9 кастрычніка, а 7 гадз. ўвечары, у памяшканьні Гаррайкому КП(б) адбудзецца інструктыўная нарада ст. старшынь выкан. бюро і т. т., якія будуць у падшэфныя вёскі для правядзеньня „Дню Урджаю", разам з агрэкомам.

Прысутнасьць паказаных асоб на гэтай нарадзе абавязкова.

ГАРРАЙКОМ КП(б)Б.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара **П. ШАСТАКОЎ.**

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Ад аўторка, 9-га кастрычніка толькі 6 гастроляй трупы ліліпутаў «Маленькі камэдыянт» Пад кіраўніцтвам Б. Ф. Маліноўскага вялікі рознастайны КАНЦЭРТ. На экране—выключны нямецкі фільм «СЫМФОНІЯ ВЯЛІКАГА ГОРАДУ».
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Ад аўторка 9-га кастрычніка падвойная праграма: „Французская лялька" драма ў 7 частках. Звыш праграмы Канцэртнае адзяленьне. Пачатак 1-га сэансу роўна а 7 гадз.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Ад аўторка, 9-га кастрычніка 2-і тыдзень „Другое жыцьцё" ў 8 частках. Каса адчынена ад 5 гадзін.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Кіно зачынена для рамонту. З аўторка, 16 кастрычніка, адчыняецца СПЭЦЫЯЛЬНА дзіцячае кіно.



БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛІ З ДРУКУ

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА:

1. КОЛАС Якуб.—Збор твораў, том I, вып. I, Стар. 246. Цана 2 руб.
2. КУПАЛА Янка.—«Збор твораў», том V, Ст. 276. Цана 2 р. 75 к.
3. ЧАРОТ М.—«Веснаход», 3-е выданьне. Стар. 308. Цана 1 р. 35 к.
4. КРАПІВА К.—«Крапіва» Стар. 172. Цана 1 р. 10 к.

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж

№ 7 „ПОЛЫМЯ" № 7

Беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

(СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ).

Пад рэдакцыяй: З. Жылуновіча, Я. Васілевіча, Янкі Купалы, М. Чарота, А. Баліцкага.

ЗЬМЕСТ:

Я. Нёманскі. Драпежнікі—раман (працяг). Міхась Зарэцкі. Віхор на балоце—п'еса (канец). Я. Ліманоўскі.—Над абрывам—аповесьць (працяг). Гэрхарт Поль.—Падарож наўкола сьвету двох пралетараў—апавяданьне. Алесь Дудар.—Імчыцца час... верш. Валеры Маракоў.—Чуеш, Беларусь?—верш. В. Палішчук—Адыгейскі пісьньнар—паэма, (пер. з украінскае мовы А. Александровіча). А. Салагуб.—Украіне—верш. С. Вальфсон.—Сям'я і шлюб пры капіталізьме. А. Цьвікевіч.—«Западно-русская» школа і яе прадстаўнікі (працяг). Ал. Шлюбскі.—Новыя матар'ялы да гісторыі беларускага рэвалюцыйнага руху. М. Касьпяровіч.—Беларуская літаратура ў Латвіі. Праф. С. Вальфсон.—Аб юбілеі Талстога. Праф. І. Замоцін.—Мастацкая творчасьць Л. Талстога. Кнігасьвіо.—А. Гародня, Л. Окіншэвіч, Я. Бараноўскі. Хроніка беларускае культуры. Хроніка ўкраінскага культурнага жыцьця.

Прымаецца падпіска да канца году.

ГАДАВЫЯ і ПАЎГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ „ПОЛЫМЯ", ЯКІЯ ЎЖО ЎНЕСЬЛІ ПЛАТУ, АТРЫМОЎВАЮЦЬ НУМАРЫ «ПОЛЫМЯ» ДА КАНЦА ГОДУ ПА РАНЕЙШАЙ РАСЦЭНЦЫ, А ТАКСАМА БЯСПЛАТНА ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК, які належыць да „ПОЛЫМЯ" на 1928 г.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на «Полымя» з дадаткам: на год—12 руб., 6 м-цаў—6 р., 3 м-цы—3 р.

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ—1 РУБ. 25 КАП.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у рэдакцыі часопісі «Полымя» (Менск, Савецкая, 63), у Центр. кнігарні БДВ (Менск, рог вул. Ленінскай і Савецкай), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ, ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, у галоўнай канторы газэты «Зьвязда» (Менск, Савецкая 63, 3-ці паверх), у канторы падпіскі на газэты „Правда" і „Известия" (Менск, Савецкая, 61), у канторы газэты «Беларуская Вёска», (Менск, Савецкая, 63) і яе ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх райёнах БССР.

За ўсімі спраўкамі аб недасылцы падпісчыкам нумароў «Полымя» просьба зьвяртацца непасрэдна ў тыя ўстановы, якімі прымалася падпіска на часопісь «Полымя».

ЗГУБЛЕНЫ:

— Партбілет за № 110510 в 29-ii-28 г., выд. Барысаўскім райкомам 2) кніжка Асавіяхіма і фото-карт. на імя Пятровіча А. К., кв. № 1336.

— Вайскова - вучотная конская карт. Сягодніка Р. В., выд. Барысаўск. вайскв. адзд., кв. 1337.

— Каапэрац. кніжка № 14316 Сальнікава Н. Н., выд. МЦРК, кв. 1338.

— Дапрызыўная кніжка № 472 Пракапоўіча М. І., выд. Бярэзінскім РВК, кв. 1315.

— Каапэрац. кніжка № 2172 Жырчука К., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 1316.

— Сяброўская позвая кніжка № 450 Жылдовіча Я., выд. Чэрвенск. спаж. т-вам, кв. 1317.

— Вучотна-конская кніжка № 976 Пархомчыка К. С., выд. Капыльскім РВК, кв. 1318.

— Сяброўская кніжка № 6340 Паўловіч Н. В., выд. саюзам працасьветы кв. 1320.

— Беспрацоўная кніжка Паўловіч Н. В., выд. біржай працы, кв. 1321.

— Сяброўскі білет Рубін Р. В., выд. саюзам працасьветы, кв. 1322.

— Пасьведчаньне аб нягодзнасьці да вайсковай службы за № 160 Шваба П., выд. Мазырск. аснаўн. вытворч. каміс., кв. 1323.

— Конская кніжка № 1169 Нямковіча С., выд. Грэскім РВК, кв. 1324.

— Палявупічы білет № 7 Дзесіевіча Г. Д., выд. Чэрвенск. калектывам палявупічых, кв. 1325.

— Вучэбн. кніжка Клімковіча, выд. Барысаўскім РВК, кв 1326.

— Вучотная кніжка № 383 Навлоўскага, выд. Барысаўскім РВК, кв. 1327.

— Пыпісная кніжка дапрызыўніка Ляшковіча В. А., выд. Плешчаніцкім РВК, кв. 1328.

— Кандыд. сяброўскі білет за № 29 КПВК і значок Елісеева С. У., кв. 1329.

— Сяброўскі білет № 15450 Елісеева С. У., выд. саюзам працаўн. зямлі і лесу, кв. 1330.

БАЛЯНС

ГОМЕЛЬСКАГА ФАРМАКІРАЎНІЦТВА НА 1-е КАСТРЫЧНІКА 1927 ГОДУ.

АКТЫЎ.

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА
1. Маемасьць	57150 —
2. Нескончаныя будынкі	12200—94
3. Тавары	295623—37
4. Грашовыя сродкі	2842—21
5. Каштоўныя паперы	6547 —
6. Паі і акцыі	2250 —
7. Вэксалі і дакументы да атрыманьня:	
а) вэксалі ў партфелі	13014—14
б) наложаныя плацяжы і дакументы да атрыманьня	466—63
8. Падсправаздачныя сумы	802—57
9. Дэбіторы:	
а) розныя 48936—07	
б) пайшчыкі 1719—38	50655—45
10. Выдаткі будучага году	9561—94
БАЛЯНС	451114—25

ПАСЫЎ.

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА
1. Асноўны капітал	24834—1[illegible]
2. Зваротны капітал	37573—5[illegible]
3. Амартызацыйны капітал	16651—7[illegible]
4. Рэзервовы капітал	30528—3[illegible]
5. Фонд палепшаньня быту	788—5[illegible]
6. Фонд санасьветы	591—1[illegible]
7. Рэзэрв нявыўных даўгоў	1719—3[illegible]
8. Розныя фонды акрэдраву	1275—2[illegible]
9. Фонд абсталяваньня зитэк	17249—2[illegible]
10. Вэксалі выдадзеныя	143154—6[illegible]
11. Крэдыторы	52215—2[illegible]
12. Падсправаздачныя сумы	231—0[illegible]
13. Прыбытці будучага году	13614—8[illegible]
14. Неразьмеркаваны прыбытак	2245—7[illegible]
15. Прыбытак за справаздачны 1925-26 год.	58447—1[illegible]
БАЛЯНС	451114—2[illegible]

Заг. Фармакіраўніцтвам ФОНГАУЗ.

Час. вык. абавяз. галоўнага бухгальтара КРЭНДЭЛЬ.

РАХУНАК

прыбыткаў і страт Гомельскага Фармакіраўніцтва за 1926-27 год.

СТРАТА		ПРЫБЫТАК	
1. Па прадпрыёмствах, адышоўшых да РСФСР	5212—51	1. Па цэнтр. аптэцы	43981—1[illegible]
2. Па лябараторыі	267—52	2. Па апт. магазыну	30534—3[illegible]
3. Па безнадзейных даўгох	34—90	3. Па фасов. адзд.	4006—8[illegible]
4. Процанты выплачаныя	8031—40	4. Па гар. аптэках	18585—2[illegible]
5. Рэзэрв. нявыўных даўгоў	1640—29	5. Па сельск. аптэк.	20712—9[illegible